Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

МАЙ 30 1933 г. № 117 (4661)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — За высокую якасьць! ІЛЬЛЯ ЭРЭНБУРГ —Апошнія бізантыйцы (3 стар.), ЧАВУСКІ, ВАЎКАВЫЦКІ, ВАКСМАН — Вытрымалі экзамэн (2 стар.).

Ліст сакратару ЦК УсеКП(б) тав. СТАЛІНУ (1 стар.).

Рэзалюцыя сходу ўсебеларускага партактыву па дакладу тав. АНЦІПАВА аб чыстцы партыі (1 стар.).

ПАСТАНОВА ПРЭЗЫДЫУМУ ЦВК БССР аб ходзе рэалізацыі пазыкі другой пяцігодкі ў БССР (2 стар.).

Чаму каапгасы Магілева ў хвасьце сяўбы (3 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

САВЕЦКІ САЮЗ МАЕ ПРАВА ГАНАРЫЦЦА СВАІМІ ДАСЯГНЕНЬНЯМІ».—Гутарка прадстаўніка ТАСС з Італьянскім паслом.

Вынікі выбараў у данцыгскі парлямант (2 стар.).

Крывавыя сутычкі паміж студэнтамі ў венскім унівэрсытэце.

Англія не згаджаецца на забарону паветранай бамбардыроўкі (4 стар).

ЗА ВЫСОКУЮ ЯКАСЬЦЬ!

Студзеньскі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) у якасьці асноўнай задачы першага году другой пяцігодкі паставіў задачу—**дабіцца высокіх якасных паказальнікаў**: Змагацца за высокую прадукцыйнасьць працы, за нізкі сабекошт, за поўнае і рацыянальнае скарыстаньне сырцу, за найбольш эфэктыўнае скарыстаньне мэханізмаў, за асваеньне новай тэхнікі, за высокую якасьць прадукцыі.

У рабоце лёгкай прамысловасьці самым вузкім месцам дагэтуль зьяўляецца нізкая якасьць тавараў шырокага ўжытку, якая выклікае законнае нездавальненьне працоўнага спажыўца.

З кожным годам расьце дабрабыт шырокіх мас рабочых і калгасьнікаў. Адначасова ўзрастаюць і ўскладняюцца іх патрабаваньні да работы прамысловасьці. Працоўныя масы прад'яўляюць павышаны попыт на тавар лепшай якасьці, лепшага асартымэнту.

Барацьба за пашырэньне вырабу прадметаў шырокага ўжытку ўступіла зараз у новы вышэйшы этап. Мала даць рынку тавары—трэба даць іменна тое, што патрабуе спажывец і прытым высокай якасьці. Толькі так можа стаяць пытаньне. Новае ў таваразвароце заключаецца ў тым, што **спажывец пачынае кантраляваць рублём работу лёгкай прамысловасьці.**

«Даць пакупцу—рабочаму і калгасьніку—тавар высокай якасьці і рознастайнага асартымэнту—такава задача»—падкрэсьліла «Правда» ў агляде друку «Прапануйце крэсла пакупцу».

Нельга, ні ў якім разе нельга так працаваць, як мы працавалі дагэтуль. Нельга дапусьціць далей таго ігнараваньня якасьці, тых напляваньняў адносін да патрабаваньняў спажыўца, якія яшчэ маюць месца на радзе прадпрыемстваў лёгкай прамысловасьці.

Даволі псаваць сырэц на выраб ня годнай прадукцыі!

Прыкладам таго, як нельга працаваць, як нельга адносіцца да якасьці прадукцыі, прыкладам злачыннага псаваньня каштоўнейшага сырцу служыць «работа» віцебскай швэйнай фабрыкі **«Сьцяг індустрыялізацыі»**.

Абсталяваная паводле апошняга слова тэхнікі, узброеная навейшымі аўтаматамі і машынамі, фабрыка «Сьцяг індустрыялізацыі» дакацілася да самага ганебнага становішча.

Ня гледзячы на наяўнасьць усіх умоў для бесперабойнага выкананьня пляну (абсталяваньне, сырэц, рабочая сіла), фабрыка выканала прамфінплян за першы квартал на 76,7 проц. Зусім дрэнныя паказальнікі даў і другі квартал. Процант браку ў першым квартале складаў 19,3 проц., а ў асобныя дэкады сакавіка-красавіка дасягаў 28 проц. **На канвэеры фабрычных цэхаў бязупынным струменем плыў брак.**

Дрэнная работа прывяла да таго, што на прадпрыемстве скапілася каля 20.000 штук незавершанай прадукцыі, якая не магла быць адпраўлена з-за дрэннай якасьці.

А якасьць вопраткі, ужо адгружанай праз «Саюзшвэйсбыт» спажывецкім арганізацыям? Аб ёй даволі ясна і пераканаўча гавораць лічбы. Сама фабрыка 30 проц. адзеленай базэм «Саюзшвэйсбыту» прадукцыі лічыла за брак, апрача таго самі базы ў адным толькі красавіку забракавалі яшчэ 9 проц. За першы квартал прад'яўлена фабрыцы штрафу на 120.000 руб. У адным красавіку—на 20.000 руб. Апрача таго шмат вопраткі зварочвалася фабрыцы для пераробкі, што ўскладняла і пагаршала работу цэхаў.

З Уралу і Сібіры, Сярэдняй Азіі і гарадоў БССР сыпяцца скаргі на дрэнную якасьць вопраткі, выробленай фабрыкай «Сьцяг індустрыялізацыі». Тое ж бачым і з шматлікіх фактаў псаваньня прадукцыі.

Партыйна-масавая і прафэсыянальная работа па фабрыцы—у заняпадзе: арганізацыі прадпрыемства адарваны ад вытворчага жыцьця, яны захапіўшыся агульнымі пытаньнямі, «сусьветнымі праблемамі», ня бачылі вытворчасьці, не заўважалі сапраўднага становішча фабрыкі.

Вельмі слаба вялася барацьба з апартуністычнымі шкодніцкімі настроямі, якія зьяўляюцца перажыткам саматужніцтва і цэхаўшчыны: быццам «канвэерная сыстэма і мэханізацыя не дазваляюць выпусьціць добрую прадукцыю».

За гэтымі гутаркамі хаваліся шкодніцкі, лодыры і бракаробы, гэтай шырмай яны прыкрывалі сваё нежаданьне працаваць, свае шкодніцкія адносіны да сырцу і абсталяваньня.

Наркамлёгпрам БССР і Белшвэйаб'яднаньне не наладзілі апэрацыйнага кіраўніцтва работай фабрыкі. Яны некалькі раз вывучалі прадпрыемства, але не давялі да канца справы, ня прынялі рашучых мер да паляпшэньня становішча фабрыкі.

На ўроках фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» трэба мабілізаваць усю нашу пралетарскую грамадзкасьць. **Трэба накіраваць ярасьць мас супроць бракаробаў.** Найпрымірная лютая барацьба павінна быць абвешчана напліваецельскім адносінам да якасьці прадукцыі, да патрабаваньняў спажыўца.

Важнейшая задача гаспадарчых і прафэсыянальных арганізацый—практычна ажыцьцявіць улік якасьці работы. Трэба, каб кожны рабочы ведаў, як ён працуе, каб ён мог параўнаць свае якасныя паказальнікі з паказальнікамі суседа, мог бачыць, ці адстае ён, ці ідзе ўперадзе.

Сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва павінны адыграць тут рашаючую ролю. Цяпер толькі **той сапраўдны ўдарнік, хто побач з колькасным выкананьнем пляну дае ўзорную высокаякасную работу, паказвае прыклады барацьбы за добрую якасьць тавараў шырокага ўжытку.**

Вялікае значэньне набывае **ўсесаюзнае спаборніцтва** на лепшую якасьць прадукцыі лёгкай прамысловасьці, якое зараз разгарнулася па ўсім Саюзе. Ні адно прадпрыемства не павінна застацца ў баку ад конкурсу. Задача партыйных, гаспадарчых і прафэсыянальных арганізацый — узначаліць уздым сацспаборніцтва, давесьці да сьвядомасьці кожнага рабочага яго абавязкі ў барацьбе за якасьць.

Мала ліквідаваць брак, трэба ўзьняць якасьць прадукцыі на тую вышыню, якая адпавядае ўзросшым запатрабаваньням мас. Трэба мабілізаваць творчую актыўнасьць і ініцыятыву рабочых на вышуканьне новых лепшых асартымэнтаў прадукцыі.

Вялікую адказнасьць за якасьць прадукцыі нясуць каапэрацыйныя і дзяржаўныя гандлёвыя арганізацыі. Іх кроўная справа — змагацца за інтарэсы спажыўца, не дапусьціць пранікненьня браку на рынак. Зусім зразумела, што факты замарожваньня таваразвароту зьяўляюцца вынікам таго, што рынкі засьмечаны таварам непатрэбнага асартымэнту.

Нашы гандлёвыя арганізацыі дагэтуль не аддавалі патрэбнай увагі пытаньню якасьці і асартымэнту. У таваразнаўчай сетцы яшчэ ня вытручаны нэпманскі душок, шкодная арыентацыя на тое, што «рынак усё зьесьць». Гэтым трэба тлумачыць тое, што гандлёвыя аб'яднаньні і базы, якія выступаюць у ролі гастаўшчыка, часта груба ігнаруюць інтарэсы спажыўца. Нізоўка ў сваю чаргу прымае тавар, не правяраючы, ці адпавядае ён свайму прызначэньню. Адсюль — затаварваньне, адсюль — цяжкае фінансавае становішча некаторых гандлёвых арганізацый. Спажывец рублём кантралюе якасьць прадукцыі.

Хіба ня грубым зьдзекам са спажыўца зьяўляюцца выпадкі перавозкі вопраткі навалам, скідваньня яе пад прылавак, навізваньня спажыўцу ўжо на непадыходзячага асартымэнту.

Такія факты маюць месца ва многіх нашых крамах.

А хаваньне бялізны, вопраткі, шаўковых вырабаў на падлозе, у брудных мяшках, у вільготных складах? Хіба гэта не сьвядомае псаваньне тавараў, за якое трэба бязьлітасна біць.

Задача павышэньня якасьці і паляпшэньня асартымэнту патрабуе лепшай арганізацыі гандлёвай работы, патрабуе сапраўднага культурнага савецкага гандлю. Трэба памятаць — савецкі рабочы і калгасьнік хоча атрымаць ня проста вопратку, абутак, мануфактуру. Ён жадае набыць высокаякасныя прадметы шырокага ўжытку. Абавязак прамысловых і гандлёвых арганізацый задаволіць гэтых законных патрабаваньні працоўных.

Ні ў якім разе нельга дапусьціць далей такой ганебнай работы, якую вяла **ленінградская швэйная фабрыка** карэньня і ганьбы. **Брак на прадпрыемстве абязьлічэн.** Кантралёры і інструктары займаюцца чым хочаце толькі не сваімі непасрэднымі абавязкамі—яны злачынна нядбайна адносяцца да шматлікіх фактаў псаваньня прадукцыі.

Партыйна-масавая і прафэсыянальная работа па фабрыцы—у заняпадзе: арганізацыі прадпрыемства адарваны ад вытворчага жыцьця, яны захапіўшыся агульнымі пытаньнямі, «сусьветнымі праблемамі», ня бачылі вытворчасьці, не заўважалі сапраўднага становішча фабрыкі.

Вельмі слаба вялася барацьба з апартуністычнымі шкодніцкімі настроямі, якія зьяўляюцца перажыткам саматужніцтва і цэхаўшчыны: быццам «канвэерная сыстэма і мэханізацыя не дазваляюць выпусьціць добрую прадукцыю.

За гэтымі гутаркамі хаваліся шкодніцкі, лодыры і бракаробы, гэтай шырмай яны прыкрывалі сваё нежаданьне працаваць, свае шкодніцкія адносіны да сырцу і абсталяваньня.

Наркамлёгпрам БССР і Белшвэйаб'яднаньне не наладзілі апэрацыйнага кіраўніцтва работай фабрыкі. Яны некалькі раз вывучалі прадпрыемства, але не давялі да канца справы, ня прынялі рашучых мер да паляпшэньня становішча фабрыкі.

На ўроках фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» трэба мабілізаваць усю нашу пралетарскую грамадзкасьць. **Трэба накіраваць ярасьць мас супроць бракаробаў.** Найпрымірная лютая барацьба павінна быць абвешчана напліваецельскім адносінам да якасьці прадукцыі, да патрабаваньняў спажыўца.

Важнейшая задача гаспадарчых і прафэсыянальных арганізацый—практычна ажыцьцявіць улік якасьці работы. Трэба, каб кожны рабочы ведаў, як ён працуе, каб ён мог параўнаць свае якасныя паказальнікі з паказальнікамі суседа, мог бачыць, ці адстае ён, ці ідзе ўперадзе.

Сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва павінны адыграць тут рашаючую ролю. Цяпер толькі **той сапраўдны ўдарнік, хто побач з колькасным выкананьнем пляну дае ўзорную высокаякасную работу, паказвае прыклады барацьбы за добрую якасьць тавараў шырокага ўжытку.**

Вялікае значэньне набывае **ўсесаюзнае спаборніцтва** на лепшую якасьць прадукцыі лёгкай прамысловасьці, якое зараз разгарнулася па ўсім Саюзе. Ні адно прадпрыемства не павінна застацца ў баку ад конкурсу. Задача партыйных, гаспадарчых і прафэсыянальных арганізацый — узначаліць уздым сацспаборніцтва, давесьці да сьвядомасьці кожнага рабочага яго абавязкі ў барацьбе за якасьць.

Мала ліквідаваць брак, трэба ўзьняць якасьць прадукцыі на тую вышыню, якая адпавядае ўзросшым запатрабаваньням мас. Трэба мабілізаваць творчую актыўнасьць і ініцыятыву рабочых на вышуканьне новых лепшых асартымэнтаў прадукцыі.

Вялікую адказнасьць за якасьць прадукцыі нясуць каапэрацыйныя і дзяржаўныя гандлёвыя арганізацыі. Іх кроўная справа — змагацца за інтарэсы спажыўца, не дапусьціць пранікненьня браку на рынак. Зусім зразумела, што факты замарожваньня таваразвароту зьяўляюцца вынікам таго, што рынкі засьмечаны таварам непатрэбнага асартымэнту.

Нашы гандлёвыя арганізацыі дагэтуль не аддавалі патрэбнай увагі пытаньню якасьці і асартымэнту. У таваразнаўчай сетцы яшчэ ня вытручаны нэпманскі душок, шкодная арыентацыя на тое, што «рынак усё зьесьць». Гэтым трэба тлумачыць тое, што гандлёвыя аб'яднаньні і базы, якія выступаюць у ролі гастаўшчыка, часта груба ігнаруюць інтарэсы спажыўца. Нізоўка ў сваю чаргу прымае тавар, не правяраючы, ці адпавядае ён свайму прызначэньню. Адсюль — затаварваньне, адсюль — цяжкае фінансавае становішча некаторых гандлёвых арганізацый. Спажывец рублём кантралюе якасьць прадукцыі.

Хіба ня грубым зьдзекам са спажыўца зьяўляюцца выпадкі перавозкі вопраткі навалам, скідваньня яе пад прылавак, навізваньня спажыўцу ўжо на непадыходзячага асартымэнту.

Такія факты маюць месца ва многіх нашых крамах.

А хаваньне бялізны, вопраткі, шаўковых вырабаў на падлозе, у брудных мяшках, у вільготных складах? Хіба гэта не сьвядомае псаваньне тавараў, за якое трэба бязьлітасна біць.

Задача павышэньня якасьці і паляпшэньня асартымэнту патрабуе лепшай арганізацыі гандлёвай работы, патрабуе сапраўднага культурнага савецкага гандлю. Трэба памятаць — савецкі рабочы і калгасьнік хоча атрымаць ня проста вопратку, абутак, мануфактуру. Ён жадае набыць высокаякасныя прадметы шырокага ўжытку. Абавязак прамысловых і гандлёвых арганізацый задаволіць гэтых законных патрабаваньні працоўных.

Ні ў якім разе нельга дапусьціць далей такой ганебнай работы, якую вяла **ленінградская швэйная фабрыка**

МАСАВА-АРГАНІЗАЦЫЙНАЙ РАБОТАЙ,

ЗМАГАЮЧЫСЯ СУПРОЦЬ ГОЛАГА АДМІНІСТРАВАНЬНЯ І КАМАНДВАНЬНЯ, ЗАБЯСЬПЕЧЫМ СВАЯЧАСОВАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ СЯЎБЫ ПА АДНААСОБНЫХ ГАСПАДАРКАХ

НАБЫВАЕ СІЛУ ПРАЗ 7 ДЗЁН...

ЕЛЬСК, 26. (Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

Ельскі раён адным з першых у БССР пачаў звышраньнюю сяўбу. Перадавыя калгасы вышлі ў поле 20 сакавіка, ледзь-толькі пасьпела прыгрэць сонца і пачаў таяць сьнег. У першай палове красавіка раённая газэта «Бальшавіцкі змагар» ужо зьмяшчала рапарты калгасаў «Дзесяты зьезд саветаў», імя Варашылава і іншых аб сканчэньні сяўбы аўса і пшаніцы.

Практыка гэтых калгасаў лепш за ўсё паказвае, што Ельшчына мае насумненна, усе магчымасьці быць у калёне перадавых раёнаў рэспублікі, выканаўшых у тэрмін і поўнасьцю плян сяўбы яравых. Гэта прызнаюць і самі раённыя работнікі. Але...

Ельск значна адстаў ня толькі ад сярэдняга процанту па паўднёвай зоне, але і ад раёнаў, якія раней цягнуліся ў хвасьце.

У спаборніцтве з Лельчыцамі, Ельскі раён здаў пазыцыі. На 25 мая Лельчыцкі раён скончыў пасьпяхова сяўбу яравых, а па Ельшчыне плян выканан толькі на 73,4 проц.

Як-жа здарылася, што, пачаўшы сеяць адным з першых, Ельск апынуўся зараз у хвасьце, злачынна зацягвае пасеўную?

Перш за ўсё аб спаборніцтве з Лельчыцамі. Спаборніцтва фактычна няма. У Ельску абмежаваліся фармальным заключэньнем сацыялістычнага дагавору з Лельчыцамі, але не паклапаціліся аб перанясэньні спаборніцтва ў калгасы, сельсаветы і вёскі. Масы калгасьніцтва і працоўных аднаасобнікаў ня былі ўцягнуты ў спаборніцтва, а ва многіх мясцох аб ім нават ня ведаюць.

РК і РВК вылучылі райупаўнаважаных па сельсаветах, паслалі туды дзесятак брыгадзіраў з раённага актыву і супакоіўшыся... пачалі чакаць зводак.

Але з палёў паступалі трывожныя весткі, зводкі паказвалі зьніжэньне тэмпаў сяўбы, сыгналізавалі аб пагрозе зрыву плянавага заданьня.

Тады людзі ляніва зьбіраліся, фіксавалі прарывы і ў дзесяты раз папярэджвалі старшынь сельсаветаў і сакратароў парт'ячэек, «аб недапушчальнасьці такога становішча з сяўбой».

Вось і ўсё, з дазволу сказаць, кіраўніцтва. У калгасах арудавалі клясава-варожыя элементы, а сельсаветы і раённыя арганізацыі праходзілі міма гэтых фактаў, ня прымалі рашучых мер супроць кулацкага сабатажу.

Старшыня РВК Зеньчык ня раз быў у Рэмязаўскім сельсавеце, добра ведаў аб вялікай засьмечанасьці калгасаў кулацкімі элементамі, але спакойна аб'яжджаў, нібы нічога ня прыкмеціўшы.

Цяпер раённыя арганізацыі ўсхамянуліся, цяпер пачалі абурацца... дрэнная работай гэтага сельсавету.

У аднаасобным сэктары кожная пяцідзёнка дае ўсё горшыя рэзультаты. На 26 мая аднаасобнікі выканалі заданьне па збожжавых на 44,3 проц., тэх нічных на 68,7 проц, бульбе на 69,1 проц.

Якая-ж масавая работа праводзіцца сярод аднаасобнікаў?

У Ельску яе разумеюць па-свойму. Старшыня РВК Зенчык знайшоў новы «мэтад узьдзейнасьці» на аднаасобнікаў, адстаючых у сяўбе. Ён загадаў замазваць вароты гэтых гаспадарак дзёгцем і пісаць на іх: «тут жыве вораг народу» (?!). У Рэмязаўскім сельсавеце гэту «масавую работу» ўжо пачалі праводзіць у жыцьцё. Патрабавалася ўмяшаньне ўпаўнаважанага ЦК, каб спыніць гэтыя агідныя «лявацкія» забавы.

Аб якасьці сяўбы ў раёне ўспомнілі зусім нядаўна. Толькі 13 мая РВК апублікаваў у райгазэце абавязковую пастанову пра аграмінімум. Прычым у пастанове сказана, што яна «набывае моц» праз 7 дзён пасьля апублікаваньня. Такім чынам, пастанова пачала дзейнічаць з 20 мая, калі больш паловы яравых ужо было засеяна і калі дрэнная якасьць многіх пасеваў стала фактам.

У калгасе «Чырвоны партызан» Стара-Высоцкага сельсавету, у калгасе імя Леніна, Санюкоўскага сельсавету, ужо да апублікаваньня пастановы былі засеяны ў аднавор дзесяткі га аўса.

У калгасе «Перамога», Засінцаўскага сельсавету, была ўжо засеяна нядобраякасным насеньнем уся плошча пад авёс.

С. ГАЛКІН.

ЗАСЛАУСКІЯ АДМІНІСТРАТАРЫ

ЗАСЛАЎЕ, 25.

Заслаўскі раён на 25 мая засеяў толькі 71,8 проц. яравога кліну. Плян па збожжавых на 25 мая выкананы толькі на 83,6 проц., у тым ліку па аўсу на 85 проц. Ільну засеяна 74,2 проц., а бульбы 61,7 проц. Заслаўшчына адстае па ўсіх важнейшых культурах.

Асабліва трэба падкрэсьліць адставаньне аднаасобнага сэктару. У той час, калі калгасы засеялі 79,1 проц. яравых, аднаасобнікі засеялі толькі 56,4 проц.

На практыцы Старасельскага сельсавету, як у люстэрку відны прычыны адставаньня Заслаўшчыны.

Старасельскі сельсавет на 20 мая засеяў толькі 56,7 проц. яравых. Важнейшае зьвяно ў барацьбе за тэмпы сяўбы — конь — выпаў з-пад увагі сельсавету, парт'ячэйкі і праўленьняў калгасаў. Перад пачаткам сяўбы коням ня далі ні аднаго дня адпачынку. Гэта выматала асабліва ўмацніць догляд каня ў часе палявых работ. Па справе-ж коні выходзілі на поле часта некормленымі і напоенымі. Так, у калгасе «Камінтэрн» у брыгадзе № 2 11 мая коні пашлі на работу некормленымі. У брыгадзе № 1 таго-ж калгасу ночку 14 мая па віне конюха і брыгадзіра Багдана 4 коняй загінулі.

Дрэнны догляд каня быў ня толькі ў гэтым калгасе.

У самы разгар сяўбы ў некаторых калгасах замест ударнай работы на палёх калгасьнікі ўзяліся за свае гароды. У калгасе «Зьвязда» старшыня Глебка сам зьяўляўся ініцыятарам зрыву сяўбы. У той час, калі калгас ня засеяў нават і 50 проц. аўса, ён прапанаваў калгасьнікам засяваць іх гароды.

Парт'ячэйка (сакратар Златкін) Старасельскага сельсавету займаецца сяўбой толькі наогул.

Напрыклад, на ячэйцы слухалі даклад аднаго старшыні калгасу аб ходзе сяўбы. У пастанове-ж выносілі вымовы ўсім старшыням калгасаў, ня выяўляючы прычын адставаньня па іншых калгасах.

Упаўнаважаны РК КП(б)Б і РВК Дзямешчанка і сакратар парт'ячэйкі Златкін замест масава-растлумачальнай работы сярод калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў займаліся грубым адміністраваньнем.

Сельсавет да 15-га мая ганебна адставаў з сяўбой аўса. Аднаасобнікі нават не пачыналі сеяць. Упаўнаважаны Дзямешчанка і парт'ячэйка на працягу першай паловы мая на гэта не рэагавалі.

Толькі 15-га мая Дзямешчанка, не падлічыўшы сілы калгасаў, не правёўшы ніякай падрыхтоўчай работы, загадвае, каб за дзень было засеяна ня менш 200 га аўса.

Сакратар ячэйкі Златкін у сваю чаргу бяжыць у калгас «Камсамолец Беларусі» і загадвае старшыні калгасу:

— Ігнатовіч, за сёньнешні дзень, каб было засеяна ня менш 20 га аўса.

Златкін на загады ня скупіцца, а справа так і ня рушыцца з месца.

Тое-ж і з аднаасобным сэктарам. Да 15 мая аднаасобнікі амаль не пачыналі сеяць. Златкін моўчкі наглядаў і ў графе аднаасобнікаў ставіў нуль. Раптам 15 мая ён выклікае аднаасобнікаў і загадвае:

— Заўтра, каб усё было засеяна, інакш будзе дрэнна.

Вось узоры «капкрэтнага і апэрацыйнага кіраўніцтва».

Раённы камітэт партыі не рэагуе на факты грубага адміністраваньня ў Старасельскім сельсавеце.

ДВАРЭЦКІ, БАРЫСКІН.

КАЛЕКТЫЎНЫМ ВОПЫТАМ І ПРАЦАЙ

— Па ўсім відаць — наша ўлада пагаспадарску ставіць пытаньне: раз мы, значыцца, каля зямлі прыстаўлены, павінны так працаваць, так не даглядаць, каб і дзяржаве норму прадаць і жывёлу ў целе трымаць, і каб сабе было колькі трэба. А ці-ж мы гэткім калгасным гуртам ды не дамо рады зямельцы? Мне здаецца так: калі не паляну-емся, нормы ўраджаю, што ў пляне, перакрыем... Быць іначай ня можа.

З такой заўвагай выступіў на агульным сходзе с.-г. арцелі «Чырвоныя ўсходы» стары калгасьнік Арцём Мінчанка, якога за шматгадовую практыку, за добрыя гаспадарчыя парады калгасьнікі звалі «калгасным аграномам».

Старога Арцёма падтрымалі дружна. Выступілі лепшыя ўдарнікі — Далінскі, Іскраў, Наймарк, Бракераў—старшыня калгасу. Парашылі і запісалі: «Поўнасьцю выканаць аграмінімум, правільна арганізаваць працу, дабіцца ўраджайнасьці па ільне — 3,5 цэнтн., па аўсе — 10, ячмені — 14, пшаніцы — 12, бульбе — 166 цэнтн. і па азімых — 10 цэнтн.

***

... Ужо ў сакавіку брыгадзіры ведалі, што і дзе ім давядзецца сеяць. Тады-ж прыехаў з усебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў іх дэлегат старшыня калгасу т. Бракераў, абгаварылі адозвы зьезду, прамову тав. Сталіна і з дня на дзень, гатовымі «да бою», чакалі вясны.

У 6 гадзін раніцы на калгасным дварэ ўжо няма нікога — усе на полі. Раніцою звычайна прыходзяць проста да сваіх коняй, запрагаюць і кожны на сваю работу, аб якой было ўжо паведамлена брыгадзірамі яшчэ з вечара. Спазьненьняў, як правіла, ня было.

Працавалі дружна, пільна сачылі за тым, каб якасьць была высокай. Адночы Гаўрыловіч Дзямід — калгасьнік другой брыгады — захацеў абзык, толькі-б хутка адарацца, пакінуў невялічкі агрэшах. Аднак-жа брыгадзір Хведаровіч не прапусьціў гэтага. Прысароміў на першы раз хлопца і прымусіў паправіць сапсутую ральню. А не заўважыў-бы брыгадзір — брыгадная бракеражная камісія не дала-б агрэху застацца. Мала таго — пільна сочыць за якасьцю работы яшчэ і агульна-калгасная прыёмачная камісія. Праз такое «сіта» агрэх не праваліцца.

Уся ўвага калгасьнікаў накіравана на тое, каб прыйсьці да асьнынга фінішу з ураджаем, які быў запісан у пратаколе. Расьсеялі 35 тон штучнага ўтнаеньня, выканалі поўнасьцю плян вывазкі гною, кожнае зерня сеялі пратручаным. Сеялі добраякасна і хутка. 20 га ільну былі засеяны за тры дні. Ня зьніжаючы якасьці выконвалі і перавыконвалі нормы. Іскраў, Валашоў, Мальцаў К. і рад іншых скарачэньняў без агрэхаў на патрэбную глыбіню ўзорвалі параконным плугам за дзень па адным гэктары. А дзед Мінчанка —«калгасны аграном» — даваў рэкорды добраякаснай сяўбы — замест двух — тры га ў дзень.

У калгасе па ініцыятыве МТС праведзен цікавы вопыт скарачэньня вегітацыйнага перыяду збожжавых культур — яравізацыя або штучнае прарошчваньне насеньня перад сяўбой. Выніхі атрымаліся нечаканыя. Яравізаваную пшаніцу засялі на 12 дзён пазьней звычайнай, якую высеялі 1-га мая, а ўзышлі абедзьве разам — 15 мая — і абедзьве на плошчы ў 14 га аднолькава добра.

Сяўба ў калгасе закончана. Але ўжо і зараз відаць плённыя вынікі працы. Усходы ільну, аўса, пшаніцы і ячменю даюць магчымасьць спадзявацца на высокі ўраджай. І гэта надзея замацаваная добраякаснай калгаснай працай, узброіла калгасьнікаў «Чырвоных усходаў» цьвёрдай упэўненасьцю — «ураджай будзе, ужо ў гэтым годзе мы будзем заможнымі». І сапраўды. Пасьля таго, як калгас здасьць дзяржаве 152 цэнтн. збожжа, вылучыць насеньні і страхавы фонды, забясьпечыць кармамі жывёлу — на разьмеркаваньне паміж калгасьнікамі застаецца яшчэ каля 200 цэнтн. або па 6—7 кгр. на працадзень колькі адных збожжавых культур.

У калгасе быў шырока папулярызаван і выкарыстоўваўся вопыт перадавых калгасьнікаў. Старшыня калгасу тав. Бракераў пільна прыслухоўваўся да дзельных заўваг старых калгасьнікаў-ударнікаў, заўсёды прысутнічаў на вячэрніх вытворчых нарадах у брыгадах. Тав. Бракераў вакол праўленьня згуртаваў моцны надзейны калгасны актыў старых практыкаў.

Калектыўным розумам і працай яны будуюць бальшавіцкі калгас.

Віт. ДАЛЬ.

Калгас «Чырвоныя ўсходы»
ГОРАЦКІ РАЁН

Сакратару ЦК УсеКП(б) тав. СТАЛІНУ!

Усебеларускі партактыў, прысьвечаны пытаньням чысткі партыі, шле сваё бальшавіцкае прывітаньне правадыру УсеКП(б) і сусьветнага пралетарыяту тав. СТАЛІНУ.

Беларуская партыйная арганізацыя, прыступаючы да выкананьня дырэктыў ЦК УсеКП(б) аб чысьцы сваіх радоў, разглядае чыстку партыі, як баявую і важнейшую задачу, якая стаіць перад усей КП(б)Б.

Ачысьціўшы свае рады ад двурушнікаў, клясавачужых элемэнтаў, буржуазных нацыяналістаў, ідэйна няўстойлівых, разлажыўшыхся і іншла-лібэральных элемэнтаў і ад людзей, падмяняючых бальшавіцкую работу беспрадмэтнай балбатнёй,—КП(б)Б яшчэ шчыльней згуртуецца вакол ленінскага ЦК для далейшай барацьбы за пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Запэўняем цябе, тав. СТАЛІН, што мы забясьпечым такое правядзеньне чысткі, якое па-бальшавіцку мабілізуе ўсю партыю на барацьбу за пасьпяховае сканчэньне сяўбы, за выкананьне прамфінпляну, за бальшавіцкае правядзеньне праполкі і ўборкі ўраджаю, за павышэньне марксыцка-ленінскага ўзроўню членаў партыі, за далейшае ўмацаваньне ролі нашай партыі, як кіраўніка і арганізатара працоўных у іх барацьбе за сацыялізм.

РЭЗАЛЮЦЫЯ СХОДУ УСЕБЕЛАРУСКАГА ПАРТАКТЫВУ ПА ДАКЛАДУ тав. АНЦІПАВА АБ ЧЫСТЦЫ ПАРТЫІ

1. Сход рэспубліканскага партактыву, заслухаўшы даклад тав. Анціпава аб чыстцы, вітае пастанову ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб правядзеньні генэральнай чысткі радоў бальшавіцкай партыі.

Неабходнасьць генэральнай праверкі ўсёй партарганізацыі і кожнага камуніста дыктуецца гіганцкімі задачамі, што стаяць перад пралетарыятам і яго авангардам у другой пяцігодцы — пяцігодцы пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Ажыцьцяўленьне гэтых сусьветна-гістарычнага значэньня задач праходзіць у абстаноўцы жорсткай клясавай барацьбы, у якой рэшткі паміраючых клясаў і іх агентура — апартуністы ўсіх масьцей зварачаюцца да ўсё больш хітрых, замаскаваных і рознастайных сродкаў барацьбы супроць лініі партыі.

У гэтых умовах асаблівае значэньне набывае барацьба за далейшае ўмацаваньне дыктатуры пралетарыяту і партыі, як кіруючай сілы гэтай дыктатуры.

Недахопы і прарывы ў ходзе с.-г. заготовак, шкодніцтва ў сыстэме Наркамзему і Трактарацэнтру, нездавальняючая падрыхтоўка і правядзеньне веснавой сяўбы паказалі, што ў паасобных зьвеньнях КП(б)Б мае месца прытупленьне клясавай пільнасьці, засьмечанасьць клясава-чужымі элемэнтамі, простае зрошчваньне з імі паасобных камуністаў, двурушніцтва. Сур'ёзныя скажэньні былі дапушчаны таксама ў практычным правядзеньні нацыянальнай палітыкі партыі, паказаўшыя, што беларускіх партыйнага, савецкага, прафэсыянальных і камсамольскіх арганізацыі не вялі бальшавіцкай барацьбы за асноўныя прынцыпы інтэрнацыяналізму, а ў радзе выпадкаў нават патуралі буржуазна-кулацкім нацыяналістычным тэндэнцыям.

Разам з тым, гэтыя недахопы, прарывы і скажэньні выявілі саноўна-панскія, спавесна-дэклярацыйныя і іншла-лібэральныя адносіны да справы з боку раду партыйных і савецкіх арганізацый БССР. Выявілі няўменьне, а часамі і простую нездольнасьць з боку паасобных членаў партыі весьці рашучую барацьбу з антыпартыйнымі, контр-рэвалюцыйнымі трацкісцкімі, права-апартуністычнымі, нацдэмаўскімі і іншымі элемэнтамі, пралезшымі ў паасобныя зьвеньні партарганізацыі.

Чыстка партыі павінна выявіць рады КП(б)Б ад чужых, прымазаўшыхся, кар'ерысцкіх, разлажыўшыхся элемэнтаў і усіх тых, хто парушае жалезную дысцыпліну ў партыі і зьніжае вартасьць члена партыі. Чыстка, будучы вынікам бальшавіцкай самакрытыкі і паказальнікам сілы нашай партыі, павінна спрыяць далейшаму павышэньню баяздольнасьці партыі, далейшаму ўмацаваньню яе аўтарытэту сярод працоўных, умацаваньню жалезнага адзінства і ідэйнай узброенасьці членаў партыі.

Чыстка павінна быць накіравана сваім пёрам супроць двурушніцкіх, трацкісцкіх, права-апартуністычных і нацдэмаўскіх элемэнтаў, што жывуць ашуканствам партыі.

Чыстка КП(б)Б будзе найсур'ёзнайшай праверкай работы ўсіх партарганізацый БССР і кожнага камуніста ў паасобку ў справе барацьбы за выкананьне гаспадарчых задач першага году другой пяцігодкі. Яна будзе праходзіць пад кутом гледжаньня бальшавіцкай барацьбы ўсіх партарганізацый БССР за свячасовае і высокаякаснае правядзеньне сяўбы, за падрыхтоўку і правядзеньне ўборачнай, пад кутом гледжаньня барацьбы за выкананьне прамфінпляну на прадпрыемствах, барацьбы з бюрократызмам, растлітвальствам, расхлябанасьцю ў савецкіх установах, барацьбы за апэрацыйнасьць і канкрэтнасьць у работе ўсіх нашых устаноў і прадпрыемстваў, за бальшавіцкае кіраўніцтва, супроць спавеснай дэклярацыйнасьці, кіраўніцтва «наскул».

«Лепш, каб дзесяць працуючых не называлі сябе членамі партыі, чым каб адзін балбатун меў права і магчымасьць быць членам партыі» (ЛЕНІН).

Актыў выказвае цьвёрдую ўпэўненасьць, што КП(б)Б пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК і правадыра партыі тав. Сталіна ў рэзультаце чысткі стане яшчэ больш адзінай, ідэйна-узросшай, яшчэ больш загартаванай, яшчэ шчыльней зьвязанай з масамі.

Партактыў заклікае ўсю КП(б)Б, шчыльна згуртаваўшыся вакол свайго бальшавіцкага кіраўніцтва, непаўхільна зьвязаць справу падрыхтоўкі да чысткі з яшчэ большым напружаньнем і арганізацыяй усіх сіл на хутчэйшае сканчэньне сяўбы.

Няхай жыве жалезн

Забясьпечыць нездклад ны пералом на сплаве

РВК, РК КП(б)Б, сплаўучасткам, сплаўканторам

Падкладны каляндарны план, зацверджаны ЦК і СНК, па станоўішчы на 20 мая выкананы толькі на 55 прац. Астатняя дэкада ідзе па значнымі прарывамі: выканана 39 проц. пляну. Нашы дырэктывы аб поўным забясьпячэньні сплаву рабочай сілай і выкананьні сплаўных работ у каляндарныя тэрміны не выконваюцца. Па радзе вучастку быць падданьне прадукцыйнасьці працы, купецкім і рэацыім настроям не дакуча рашучы адпор.

Да скончэньня першага перыяду навігацыі застаюцца лічаныя дні. Зрыў пляну першага перыяду сарве агарацыйныя планы усёй навігацыі. Становішча патрабуе безадкладнага пералому ў бліжэйшыя дні. Папярэджваем аб усёй сур'ёзнасьці і важнасьці выкананьня шпаку. Вашу ўвагу вядзіце пуску дрэўніны, работа фармоўчых пунктаў. Усе работы забясьпечыць поўнасьцю рабочай на нашых плянах. Папярэджваем, каб у бліжэйшыя дні ня будзе зроблен рашучы пералом, будуць прыняты суровыя меры ўзьдзеяньня.

СНК БССР ГАЛАДЗЕД.
ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.

Аб арганізацыі сярод пісьменьнікаў і драматургаў БССР конкурсу на лепшы драматургічны твор

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Абвясьціць конкурс пісьменьнікаў і драматургаў БССР на стварэньне лепшых тэатральных п'ес як для прафесіянальных тэатраў, так і для тэатраў — гурткоў самадзейнасьці (тэмы па выбару пісьменьнікаў з сацбудаўніцтва СССР і БССР і з рэвалюцыйнага руху за мяжой. П'есы могуць быць напісаны на мовах усіх нацыянальнасьцяй БССР).

2. Для прызначэньня лепшых драматургічных твораў, прадстаўленых на конкурс, устанавіць 8 премій, з іх 5 премій за творы для прафесіянальных тэатраў і тры — для самадзейных. Премії ўстанавіць наступныя:

а) за п'есы для прафесіянальных тэатраў: адна премія ў 10.000 руб., дзьве премії—па 5.000 руб. і дзьве—па 3.000 руб.;

б) для самадзейных тэатраў: адна премія ў 5.000 р., другая—у 3.000 руб. і трэцяя — 1.000 руб.

Тэрмін здачы п'ес — 15 сьнежня 1933 году. П'есы могуць быць прадстаўлены на конкурс пад дэвізам або за подпісам аўтара.

3. Для разгляду прадстаўленых на конкурс п'ес і прысуджэньня премій вызначыць журы ў складзе т. т.: ЛЯЎКОЎ (старшыня), ЧАРНУШЭВІЧ І ДУНЕЦ (намесьнікі старшыні), членамі журы — т. т. КЛІМКОВІЧ (старшыня арткамітэту СОПБ), ЛІЦВІНАЎ (мастацкі кіраўнік БДТ-1), РАФАЛЬСКІ (мастацкі кіраўнік ЯДТ), МІЦКЕВІЧ (мастацкі кіраўнік БДТ-2), ПАКРОЎСКІ (дырэктар БДТ-1), АЛЕКСАНДРОВІЧ, КУПАЛА.

Старшыня СНК БССР ГАЛАДЗЕД.
Кіраўнік спраў СНК БССР С. КАНДЫБОВІЧ.

Забясьпечыць кіраўніцтва кампаніяй ператарыфікацыі аплаты працы настаўнікаў

За подпісам заг. культпропам ЦК КП(б)Б тав. ЛЯЎКОВА ўсім гарадзкім і раённым камітэтам партыі паслана тэлеграма, у якой прапануецца:

«Забясьпечыць апэрацыйны кіраўніцтвам кампанію ператарыфікацыі аплаты працы настаўнікаў. Аказаць канкрэтную дапамогу і мабілізаваць працоўныя масы на хутчэйшае ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі аб школе».

Аб ходзе рэалізацыі ў БССР пазыкі другой пяцігодкі

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

Заслухаўшы даклад начальніка Кіраўніцтва ашчадкасамі і Дзяржкрэдыту БССР тав. Саўкова аб ходзе рэалізацыі ў БССР пазыкі другой пяцігодкі, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР адзначае вялікі энтузіязм, з якім працоўныя масы БССР сустрэлі пастанову сораду Саюзу ССР аб выпуску новай пазыкі. Гэты факт сьведчыць аб сьвядомых адносінах працоўных мас да забясьпячэньня выкананьня праграмы сацыялістычнага будаўніцтва, аб польскім давер'і і падтрыманьні шырокімі масамі мерапрыемстваў партыі і ўраду.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР са здавальненьнем адзначае вялікарэйшыя посьпехі, якіх дабіліся ў выніку шырокай масавай работы на працягу некалькі дзён буйнейшыя прапагандыцкія цэнтры БССР — Менск, Віцебск, Гомель і раёны: Жыткавіцкі, Заслаўскі, Дзяржынскі, Слуцкі, Аршанскі, Чырвона-Слободзкі, Клімавіцкі, Старобінскі і Лепельскі, якія перавыканалі плянавыя заданьні па рэалізацыі пазыкі.

Разам з гэтым Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР адзначае недапушчальна дрэнны ход рэалізацыі пазыкі па Ўкраінскім, Бешанковіцкім, Сураскім, Чэрыкаўскім, Веткаўскім, Парыцкім, Вушацкім, Талачынскім, Чачорскім, Церахоўскім, Крупскім, Кармянскім, Прапойскім, Сіроцінскім і Чашніцкім раёнах, што выяўляецца вынікам палітычнай недбайнасьці і бязьдзейнасьці райвыканкомаў, саветаў, кам'ёдаў і фінансава-крэдытных сыстэмаў гэтых раёнаў у галіне рэалізацыі пазыкі, апортуністычнага нянуменьня і лажа.

Заданьня ўзначаліць энтузіязм мас у барацьбе за сваячасовае і поўнае разьлікі пазыкі сярод працоўных мас і спроб адзіночкі гэту справу, устанавляючы чарговасьць кампаній замест шырокай увязкі рэалізацыі пазыкі з вясновай пасеўнай кампаніяй.

Выходзячы з вышэйпаказанага Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

1. Парадаць витэбку і працоўным масам парадку Менску, Віцебску і Гомелю і Жыткавіцкага, Заслаўскага, Дзяржынскага, Слуцкага, Аршанскага, Чырвона-Слободзкага, Клімавіцкага, Старобінскага і Лепельскага раёнаў, атрымаўшым новую буйную перамогу ў сацыялістычным будаўніцтве, шчыраз прыбітаньне.

2. Прапанаваць райвыканкомам і сельсаветам, якія адстаюць у рэалізацыі пазыкі другой пяцігодкі, неякладна па-баявому разгарнуць кампанію па рэалізацыі пазыкі, увязаўшы гэту работу з вясновай сяўбой і на падставе шырокай масавай работы, разгортваючы сацыялістычныя мэтады работы, на працягу бліжэйшых 2.3 дзён выканаць заданьні па рэалізацыі пазыкі.

3. Прапанаваць цэнтральнай камісіі сядзейнасьці дзяржкрэдыту і ашчадкасам пры Прэзыдыуме ЦВК БССР на працягу адной дэкады правярыць работу раённых і сельскіх камсодаў у адстаючых раёнах і зрабіць адпаведныя выводы.

4. Адносячы значнае адставаньне ў рэалізацыі пазыкі сярод аднаасобнага сэктару вёскі (9,9 проц.) выключна за лік недапушчальна слабай масавай работы сярод беднякоў і сераднякоў — аднаасобнікаў, прапанаваць райвыканкомам, саветам і камсодам шляхам неадкладнай актывізацыі масавай работы забясьпечыць у бліжэйшыя дні поўнае выкананьне заданьняў па рэалізацыі пазыкі сярод аднаасобнікаў.

5. Прапанаваць райвыканкомам, саветам, камсодам і Кіраўніцтву ашчадкасам і Дзяржкрэдыту БССР неадкладна правярыць раздачу пазыкарыхмальнікам аблігацый мінулых пазык, прыцягнуўшы затрымліваючых выдачу аплочаных аблігацый да адказнасьці. Далейшую работу па рэалізацыі пазыкі суправаджаць папярэднім абслугоўваньнем пазыкатрымальнікаў, суцэльнай праверкай аблігацый, выяўленьнем і аплатай на месцы выйгрышаў і процантаў па аблігацыях пазык.

6. Даручыць НКЮстыцы забясьпечыць тэрміновы разгляд спраў па абвінавачаньні ў злоўмысным абслугоўваньні пазыкатрымальнікаў, арганізаваўшы па гэтых справах рад паказальных працэсаў.

7. Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР зварачаецца да парадавых у рэалізацыі пазыкі гарадоў, раёнаў, саветаў, прадпрыемстваў, саўгасаў, калгасаў, калгасных брыгад і асобных вёсак з заклікам узяць на грамадзкі буксір адстаючыя раёны, саветы, калгасы, калгасныя брыгады, прадпрыемствы і вёскі.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ЧАРВЯКОЎ.
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР М. ГНІЛЯКЕВІЧ.

29 мая 1933 г.
гор. Менск.

Пазыка ў БССР павінна быць поўнасьцю рэалізавана ў бліжэйшыя пяць дзён

(Гутарка з народным камісарам фінансаў БССР тав. ХАЦКЕВІЧАМ)

Вялізарнейшая задача другой бальшавіцкай пяцігодкі—пабудова бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва—патрабуе далейшага ўмацненьня фінансавай базы Савецкага саюзу. Адной з важнейшых крыніц фінансаваньня сацыялістычнага будаўніцтва зьяўляецца ўнутры - дзяржаўны крэдыт, які ўвайшоў у грамадзкі быт рабочых, калгаснікаў і шырокіх працоўных мас гораду і вёскі.

Дзякуючы падтрыманьню шырокімі масамі працоўных гораду і вёскі ўсіх мерапрыемстваў камуністычнай партыі і савецкай улады плян па дзяржаўных пазыках за першую пяцігодку значна перавыкананы. Замест вызначаных па СССР 3.116 мільёнаў руб. рэалізавана за першую пяцігодку пазык на 5.863 млн. руб. Па БССР рэалізавана пазык на 113 млн. руб. замест вызначаных па пляну 60 млн. руб.

Выпушчаная ўрадам СССР згодна патрабаваньням самых рабочых перадавых прадпрыемстваў і калгасаў пазыка другой пяцігодкі была спаткана з боку рабочых і шырокіх мас працоўных Савецкай Беларусі з вялізарнейшым энтузіязмам, творчым усцымам і актыўнасьцю. Рад перадавых прадпрыемстваў БССР, як завод імя Варашылава, «Камунар», «Бальшавік», «Кастрычнік», імя Ланцуцкага, Белдрэс імя Сталіна, швейная «Прафінтэрн», цэмантны завод, дрэваапрацоўчы камбінат у Бабруйску паказалі бальшавіцкія тэмпы ў правядзеньні падпіскі на пазыку і на працягу аднаго-двух дзён рапартавалі партыі і ўраду ня толькі аб выкананьні, але і аб перавыкананьні заданьня па пазыцы.

У справе рэалізацыі пазыкі адыгрывалі і адыгрываюць вялізарнейшую ролю наш цэнтральны, гарадзкі і раённы друк, а таксама масава-грамадзкія арганізацыі — прафсаюзы, камсамол, піянеры, Асоавіяхім, Чырвоны крыж, МОПР і інш.

Дзякуючы разгортваньню шырокай, бальшавіцкай, палітычна-масавай работы, мабілізацыі шырокіх мас працоўных на справу рэалізацыі пазыкі, рад гарадоў і раёнаў, як напрыклад: Менскі, Віцебскі, Гомельскі, Аршанскі, Слуцкі, Дзяржынскі, Заслаўскі, Лепельскі, Жыткавіцкі, Клімавіцкі, Чырвонаслободзкі, Старобінскі і інш. перавыканалі ўжо заданьне. Значная частка гарадоў і раёнаў ужо наблізіцца да поўнага выкананьня заданьняў па пазыцы.

На сёньняшні дзень па БССР рэалізавана пазыкі на суму 52.429 тыс. руб. — ці 78 проц. заданьня.

Аднак, некаторыя гарады і раёны адстаюць у гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі. Гэтыя раёны не далі магчымасьці БССР скончыць падпіску на пазыку разам з другімі перадавымі гарадамі, краямі і вобласьцямі Савецкага саюзу.

Гэта становішча тлумачыцца напершае ня зусім уважлівымі адносінамі да пазыкі з боку некаторых, нават партыйных арганізацый. Напрыклад, у Прапойскім раёне як паведамілі газеты «Зьвязда» і «Рабочый», сакратар РК КП(б)Б ня толькі ня стаў на чале кіраўніцтва кампаніі па рэалізацыі пазыкі, а нават забараніў скліканьне нараду прадстаўнікоў сельсаветаў, кам'ёдаў па пытаньні рэалізацыі пазыкі, а таксама забараніў асьвятленьне кампаніі ў раённай газеце, заявіўшы, што «раённая газэта патрэбна для пасеўкампаніі».

Падобныя недапушчальныя зьявы мелі месца ў Бельшавіцкім, Смалявіцкім, Сіроцінскім, Крупскім і інш. хвасьлівіцкіх у правядзеньні пазыкі раёнах.

Адстаючыя раёны ня здолелі ўлязць пазыкавай кампаніі з баявой задачай бальшавіцкай сяўбы і дапусьцілі апартуністычны самацёк у рэалізацыі пазыкі. Зусім нецярпімым зьяўляецца той факт, што ў цэлым радзе раёнаў фінансава-ашчадны апарат ня толькі не забясьпечвае належную арганізацыю і апэрацыйнае кіраўніцтва ходам кампаніі, але праўляе поўную бязьдзейнасьць у афарбленьні той вялізарнейшай работы па рэалізацыі пазыкі, якую праводзяць нашы прафсаюзныя, камсамольскія і грамадзкія арганізацыі.

Неабходна адзначыць і тое, што, ня гледзячы на суровую забарону ЦК і СНК — мабілізаваць работнікаў фінансава-ашчаднага апарату на іншыя кампаніі, у радзе раёнаў мае месца адрыў работнікаў ашчадных кас на розныя кампаніі.

Самым адстаючым вучасткам у справе рэалізацыі пазыкі зьяўляецца неарганізаваная, аднаасобная вёска і неарганізаваныя групы гарадзкога насельніцтва. У той час, калі сярод рабочых і служачых ужо амаль поўнасьцю рэалізавана заданьне па пазыцы, сярод гарадзкога неарганізаванага насельніцтва заданьне выканана на 80,7 проц. і сярод аднаасобнага сэктару вёскі на 9,9 проц.

Вельмі дрэнна праходзіць рэалізацыя пазыкі і на сезонных вучастках работ—на торфараспрацоўках, сплаўных вучастках, гідра-мэліярацыйных работах, шляхавым будаўніцтве і г. д.

На гэтыя адстаючыя вучасткі работы павінна быць зараз-жа зьвернута асаблівая ўвага з боку ўсіх арганізацый і ў першую чаргу з боку прафсаюзаў і гаспадарчых органаў, яднаючых і кіруючых гэтымі сезоннымі работамі.

Задача хутчэйшага завяршэньня пазыковай кампаніі патрабуе неадкладнай перабудовы ўсёй арганізацыйна-масавай работы. Трэба неадкладна зьнішчыць наяўныя недахопы, якія праяўляюцца з боку фінансава-ашчаднага апарату і камсодаў у справе абслугоўваньня пазыкатрымальнікаў. Разам з пазыкай неабходна правесьці масавую праверку выйгрышаў па мінулых пазыках, забіць поўнай роздачы аплочаных аблігацый «чацьвертага завяршальнага».

Вопыт перадавых прадпрыемстваў, МТС, саўгасаў, калгасаў, саветаў, паказаўшых бальшавіцкія прыклады работы па распаўсюджваньні пазыкі, павінен быць перадан адстаючым раёнам, сельсаветам, калгасам і вёскам, шляхам арганізацыі буксірнай дапамогі, шэфства рабочых прадпрыемстваў, сацпаборніцтва і ўдарніцтва.

Прыклады работы перадавых арганізацый і паасобных ударнікаў у рэалізацыі пазыкі па БССР паказваюць, што на падставе поўнай добраахвотнасьці, недапушчаючы мэтадаў адміністраваньня, перагібаў і скрыўленьняў, на падставе шырокай, арганізацыйна-масавай, растлумачальнай работы, мы можам з посьпехам закончыць рэалізацыю пазыкі ў бліжэйшыя пяць дзён у кожным раёне і сельсавеце па ўсіх групах працоўнага насельніцтва.

Вынікі выбараў у данцыгскі парлямант

Выбары ў абставінах жорсткага фашысцкага тэрору

ДАНЦЫГ, 29. (БЕЛТА). Згодна папярэдніх вестак, у выбарах у данцыгскі фольксітаг прыняло ўдзел 215 тысяч чалавек — 97 проц. выборнікаў. НАЦЫЯНАЛ-САЦЫЯЛІСТЫ разам са сваімі саюзьнікамі з «Мадагерманцамі» атрымалі 109 ТЫСЯЧ ГАЛАСОЎ супроць 106 тысяч галасоў, атрыманых усімі астатнімі партыямі: САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫ — 38 ТЫСЯЧ ГАЛАСОЎ, КАМУНІСТЫ — 15 ТЫСЯЧ ГАЛАСОЎ, ЧОРНА-БЕЛА-ЧЫРВОНЫ БЛЁК (нямецкія нацыянялісты) — 14 ТЫСЯЧ, ПАРТЫЯ ЦЭНТРА — 31 ТЫСЯЧА і польскія партыі — 6.700 ГАЛАСОЎ.

Пры апошніх выборах нацыянал-сацыялісты атрымалі 32 тысячы галасоў, сацыял-дэмакраты — 50 тысяч, камуністы — 20 тысяч, чорна-бела-чырвоны блёк — 26 тысяч, партыя цэнтру — 30 тысяч, і польскія, партыі — 6.300 галасоў.

НАЦЫЯНАЛ-САЦЫЯЛІСТЫ ў новым фольксітагу атрымоўваюць 37 МАНДАТАЎ, САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫ — 13, КАМУНІСТЫ — 5, ЦЭНТР — 11, НАЦЫЯНАЛІСТЫ — 4, і ПОЛЬСКІЯ ПАРТЫІ — 2 мандаты.

ВЫБАРЫ АДБЫВАЛІСЯ Ў АБСТАВІНАХ ЖОРСТКАГА ТЭРОРУ супроць рабочых арганізацый, асабліва супроць камуністычнай партыі. На чале выбарчага сьпісу камуністаў знаходзіцца ПЛЕНЬНІКОЎСКІ, які зараз зьняволены ў турме.

Крывавыя сутычкі паміж студэнтамі ў вясенніх унівэрсытэтах

ВЕНА, 28. (БЕЛТА). Сёньня ў часе арганізаванага каталіцкімі студэнтамі сходу ў памяць расстрэляных французамі германскага афіцэра Шлягэтэра, у будынку венскага унівэрсытэту адбыліся крывавыя сутычкі паміж крыўдзінска-сацыялістычнымі і нацыянал-сацыялістычнымі студэнтамі. Шмат студэнтаў цяжка паранена. Прыбыўшыя на сход прэм'ер Дольфус і міністар юстыцыі Шушнінг, якія павінны былі выступіць з прамовамі, былі спатканы варожымі крыкамі і вымушаны былі пакінуць. Нежаркі сот паліцэйскіх акружыў будынак унівэрсытэту і вынесьціі аатуль нацыянал-сацыялістаў. Праведзены шматлікія арышты нацыянал-сацыялістскіх студэнтаў.

„ЛЕПШ ПАМРЭМ З ГОЛАДУ, АЛЕ НЯ БУДЗЕМ ШТРЭЙКБРЭХЕРАМІ"

Ва ўчарашнім нумары нашай газэты мы надрукавалі артыкул аб магутных забастовачных баёх беластоцкага пралетарыяту, які ўжо 6 тыдняў вядзе барацьбу супроць наступленьня капіталістаў.

Сьледам за забастоўкай беластоцкіх тэкстыльшчыкаў выбухнула забастоўка рабочых гайнаўскіх лесапільных заводаў. Капіталісты і фашысты напружваюць усе сілы, каб зламаць гэтую гераічную барацьбу пралетарыяту Заходняй Беларусі.

Сёньнішні нумар сацыял-фашысцкай газэты «Роботнік» прыносіць паведамленьні аб тым, як фашызм пры дапамозе беспрацоўных хацеў сарваць забастоўку гайнаўскіх рабочых.

«У Бельску (Беластоцкая акруга), — піша газэта — ёсьць капя 300 беспрацоўных, якія жывуць у крайняй нэндзы. Толькі невялікая частка з іх атрымлівае ў дзень, як дапамогу, 200 грам хлеба, большасьць-жа не атрымлівае нічай дапамогі. Усе рэчы, якія прадстаўлялі сабой якую-небудзь каштоўнасьць, даўно прададзены. Беспрацоўныя, даведзеныя да роспачы, пайшлі да старасты з патрабаваньнем працы або дапамогі. Староста адаслаў іх у Беласток да ваяводства. У Беластоку ваяводзкі начальнік бясьпекі пан БРОДОВІЧ прапанаваў беспрацоўным пасхаць на працу ў Гайнаўку, «бо там, — казаў ён, — мясцовыя рабочыя ня хочуць працаваць, а толькі робяць забастоўку».

На гэтую прапанову пан Бродовіч атрымаў рашучы адказ: «ЛЕПШ ПАМРЭМ З ГОЛАДУ, АЛЕ НЯ БУДЗЕМ ШТРЭЙКБРЭХЕРАМІ».

(Упасн. Інфарм.).

Адкрылася антыфашысцкая канфэрэнцыя Парыскай вобласьці

ПАРЫЖ, 28 (Белта). Учора адкрылася антыфашысцкая канфэрэнцыя Парыскай вобласьці. На канфэрэнцыі прысутнічае каля 1.000 делегатаў—прадстаўнікоў буйнейшых заводаў і раёнаў Парыскай вобласьці. Дакладчыкі Гурэ (Усеагульная ўнітарная канфэрэнцыя працы), сацыяліст Маларт і дэпутат Бэрнэры (выпаўшы ня даўна з радыкал-сацыялістскай партыі заклікалі стварыць фронт.

Марсэль Кашэн выкрыў тактыку сацыялістычных лідэраў, якія адмовіліся пайсьці на стварэньне адзінага фронту, і заявіў, што кампартыя гатова аддаць усе свае сілы і энэргію на стварэньне адзінага баявога фронту супроць фашызму.

Раскол у міжнародным саюзе пісьменьнікаў

ВЕНА, 28. (БЕЛТА). Згодна паведамленьня з Рагузы (Югаславія), там адкрыўся кангрэс міжнароднага клюбу пісьменьнікаў «Пэнклюб». Прысутнічаюць делегаты эўрапэйскіх і амэрыканскіх краін. Старшыня кангрэсу англійскі пісьменьнік Уэльс абмежаваўся ў прывітальным слове абстрактнымі пратестамі супроць «вакоту Германіі да родніцтвеча». Выступіўшы пасьля яго арэатар з выключнай рэакацыю ганьбілі фашысцкі рэжым у Германіі і ўносілі канкрэтныя рэзалюцыі аб барацьбе супроць антыкультурных дзеяньняў нацыянал-сацыялістаў. Ад імя саюзу сацыялістычных пісьменьнікаў Аўстрыі, пісьменьнік Сонка прапанаваў кангрэсу вітаць усіх, хто праследуецца, пакутуе ў турме, усіх засланых германскіх пісьменьнікаў, у першую чаргу Асецкага, Рэйна і Мюзама.

Французкі делегат Крэм'е і бельгійскі делегат Тома рэзка пратэставалі супроць прасьлядваньня літаратуры ў Германіі. Італьянскі пісьменьнік Марынэтці ганьбаваў ганеньне на германскіх яўрэяў. З прычыны пагрозы германскай делегацыі, што яна пакіне кангрэс і выступіць з «пэнклюбу», кіраўніцтва кангрэсу прыняло кампрамісную пастанову адкласьці спрэчкі аб палітыцы ў Германіі да наступнага кангрэсу.

Калі старшыня кангрэсу Уэльс даў слова германскаму пісьменьніку, дык пэруанская, аўстрыйская, швэйцарская і галяндзкая делегацыі пакінулі кангрэс. Гэтая дэманстрацыя часткі кангрэсу расцэньваецца, як раскол у «Пэнклюбе».

Кангрэсам прынята рэзалюцыя, упесеная бэльгійскай делегацыяй аб тым, што асноўнай задачай «Пэнклюбу» зьяўляецца барацьба супроць прыгнётаньня свабоды мысьлі і свабоды друку.

3.300 мільёнаў даляраў на ўзбраеньне арміі ПАЗШ

Новы законапраект Рузвэльта

ВАШЫНГТОН, 28. (БЕЛТА). Палата прадстаўнікоў ухваліла прамысловы законапраект Рузвэльта, які праду гледжвае скасаваньне законадаўчых аб межаваньняў дзейнасьці трэстаў, фіксаваньне цэн і зарплаты і нармаваньне вытворчасьці на аснове ліцэнзій. Далей законапраект прадугледжвае асыгнаваньне 3.300 млн. даляраў на «грамадзкія работы», у тым ліку на шырокае будаўніцтва ваенных самалётаў і марскіх суднаў і на мэханізацыю арміі. Законапраект перадан у сэнат.

Як паведамляюць, Рузвэльт адмаўляецца абмяркоўваць пытаньне аб перагляде французкіх ваенных даўгоў, пакуль Францыя не заплоціць сьнежаньскага ўзносу.

ПА ШПАЛЬТАХ СССР

МАСТАЦКІЯ КАДРЫ, НАРОДЖАНЫЯ КАСТРЫЧНІКАМ

З 9 па 24 мая ў Маскве адбываўся першы ўсесаюзны конкурс музыкаў. Гэты конкурс паказаў высокі ўзровень савецкай музыкальнай культуры і прадэманстраваў рад выдатных музыкальна-мастацкіх талентаў.

Конкурс зьявіўся бліскучай дэманстрацыяй агульнага росту пралетарскай культуры СССР. У ім прымалі ўдзел звыш 100 выканаўцаў, адабраных на абласных і рэспубліканскіх конкурсах. У спаборніцтве было ўцягнута некалькі сот маладых музыкаў — лічба, якую ніколі на ведала дарэвалюцыйная Расія.

Прэміі атрымалі 26 чал. Першымі прэміямі ўзнагароджаны ўдзельнікі конкурсу, маладыя майстры музыкальнай культуры — Гілельс (фартэпіяна), Фішман (скрыпка), Цомык (віяланчэль), Кнушэвіцкі (віяланчэль), Крутыкава, Лявонцева і Гайдай (сьпевы).

Савет Народных Камісараў СССР, адзначыўшы выдатныя музыкальна-мастацкія здольнасьці юных музыкаў Б. Гальштэйна, А. Каплана, Б. Прытыкіной і Лізы Гілельс, устанавіў ім прэміі ў разьмеры 3.000 руб. кожнаму. Самуіл Гілельс прэміяваны ў 4.000 руб. («ИЗВЕСТИЯ»).

ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ ДАГЕСТАНСКАЙ ССР

Краявая камісія па кіраўніцтве сацспаборніцтвам на лепшае правядзеньне веснавой сяўбы пастанавіла перадаць Чырвоны сьцяг Крайвыканкому імя першай вясны другой пяцігодкі — Дагестанскай аўтаномнай ССР. Рэспубліка на 15 дзён раней тэрміну выканала плян веснавой сяўбы ў разьмеры 230 тыс. га: па збожжавых на 103,7 проц., па бавоўне — 100 проц., па каласавых — на 105 проц.

Лепшы раён Дагестану атрымаў прэмію — адну легкавую аўтамашыну. Пяці перадавым калгасным брыгадам выданы прамтаварэ на 1.500 руб. кожнай і радыёўстаноўкі; брыгадзіры прэміяваны імённымі гадзіньнікамі.

Пяці лепшым трактарным брыгадам выдана прамтавараў на 1.000 руб. кожнай і па адной пуцёўцы ў дом адпачынку для перадавых трактарыстаў. («Молот»).

АВІЯЦЫЯ НА СЛУЖБЕ АСВАЕНЬНЯ АРКТЫКІ

У гэтым годзе значна пашыраецца работа савецкай авіяцыі ў Арктыцы. За палярным колам будзе працаваць 16 самалётаў. Урад паставіў перад Галоўным кіраўніцтвам Паўночнага морскага шляху задачу — ажыцьцявіць сквазны шлях ад Мурманску да Вэрынгавага праліву. Гэту задачу павінна ўжо ў бягучым годзе вырашыць савецкая авіяцыя.

Пяць цяжкіх морскіх самалётаў зоймуцца на вучастках Новая Зямля — Вэрынгаў праліў дальнімі разьведкамі, пракладваючы шлях для суднаў. Гэтыя самалёты ўладаюць магутнасьцю ў 1.400 конскіх сіл кожны і грузападъёмнасьцю ў 3,5 тоны. Кожны з іх мае на барту радыёстанцыю ў 300 ватт. У гэтым-жа годзе ўпярэдзіць арганізуюцца авіябазы ў найбольш цяжка прахадзімых раёнах Паўночнага Ледавітага акіяну — на мысе Чэлюскіна і на мысе Паўночным.

У бліжэйшы час пачне працаваць рэгулярная паветраная лінія на Енісеі. Самалёты пакідаюць пасталінную сувязь паміж Краснаярскам, лесазаводамі Іграркі (самы паўночны порт СССР) і горнымі капальнямі Курэйкі. Усе гэтыя пункты знаходзяцца на адлегласьці 2.000 кілёмэтраў ад магістралі чыгункі. Наогул летам г. г. у Арктыцы будуць працаваць 53 лётнікі. («Правда Севера»).

АПАРАТ ПА ДОСЬЛЕДАХ ДЫХАЛЬНЫХ ШЛЯХОЎ

Дасьледчыя экспэрымэнтальныя майстэрні Усеукраінскага ота-рына-лярынгалёгічнага інстытуту зрабілі спэцыяльны аўтаапарат для досьледаў дыхальных і стравахдных органаў (горла, бронхі, стравход і інш.). Аўтаапарат дасьць магчымасьць паставіць дакладны дыягноз захворваньняў дыхальных і стравахдных органаў, выцягнуць пабочныя прадметы, якія трапяць у горла і бронхі, і тым уніканць небясьпечнай апэрацыі — трахеатоміі.

Апарат гэты раней прывозіўся з-за мяжы. Ён зроблен выключна з савецкіх матар'ялаў. («Вісті»).

ВЫТРЫМАЛІ ЭКЗАМЭН...

Вопыт слуцкай кампэрацыі

Брыгада „Зьвязды" на Случчыне: ЧАВУСКІ, ВАЎКАВЫЦКІ, ВАКСМАН

Цэнтральная конкурсная камісія пастанавіла ўзнагародзіць пераходным чырвоным сьцягам спажывецкую кампэрацыю Слуцкага раёну за вялікія посьпехі ў арганізацыі абслугоўваньня пасеўнай кампаніі.

Слуцкі раён адным з першых да тэрміну скончыў сяўбу. У гэтай перамозе вялікую ролю адыграла спажывецкая сыстэма Случчыны.

Бюро райкому партыі, пад'агуліўшы вынікі сяўбы, выразна паказ'яліла, што спажывецкая кампэрацыя, дзякуючы перабудове работы сельспажыўтаварыстваў тварам да с.-г. вытворчасьці, у значнай ступені дапамагла пераможнаму выкананьню плянаў сяўбы.

У першым і другім кварталах уся ўвага райспажыўсаюзу і сельспажыўтаварыстваў была накіравана на падрыхтаваньне работы сыстэмы задачам выкананьня пасеўнага пляну.

Зусім правільна лічачы, што добрая арганізацыя тавараабароту зьяўляецца асновай з асноўных фактараў выкананьня чарговых гаспадарча-палітычных задач, праўленьне райспажыўсаюзу зьвярнула сваю асноўную ўвагу на павялічэньне завозу прамтавараў у раён, на лепшае задавальненьне патрэб калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў.

Райспажыўсаюз не абмежаваўся прасоўваньнем тавараў, якія паступілі ў парадку плянавага завозу, а сам вельмі энергічна разгарнуў дэцэнтралізаваны закупкі прамтавараў. Пачынаючы з 1 студзеня, у парадку дэцэнтралізаваных закупак завезена ў сельспажыўтаварыствы розных дэфіцытных прамтавараў на 484 тыс. руб. Дзякуючы гэтаму, плян тавараабароту першага кварталу выкананы на 130 проц. Да 20 мая плян другога кварталу ўжо выкананы на 86 проц.

Спажывецкая сыстэма Случчыны здолела правільна ўлучыць разгортваньне тавараабароту з пераважным спабжэньнем ударнікаў сяўбы. Яна адмовілася ад пастаянных канфліктаў, пабудаваных на аснове ўліку колькасьці насельніцтва. Яна добра зразумела, што мала разгарнуць тавараабарот, трэба, каб тавараабарот спрыяў пасьпяховаму выкананьню па стаўленых перад раёнам важнейшых гаспадарча-палітычных задач. Вось чаму тавараспабжэньне будавалася ў залежнасьці ад ходу сяўбы. Асноўнымі показальнікамі для вызначэньня колькасьці тавараў, якія трэба завезьці ў тое ці іншае ССТ, зьяўляліся не статыстычныя даныя аб колькасьці насельніцтва, а пяцівёсенныя зводкі аб падрыхтоўцы і ходзе сяўбы. Для лепшага абслугоўваньня спажыўца ў часе падрыхтоўкі да сяўбы было адкрыта 10 новых крам.

Для таго, каб палепшыць спабжэньне калгаснікаў, каб пашыраваць спабжэньне задачам выкананьня вытворчых плянаў, райспажыўсаюз і сельспажыўтаварыствы адкрылі спэцыяльныя крамы ў буйных калгасах раёну. Кароткі тэрмін работы гэтых крам паказаў, што яны добра задавальнялі вытворчыя патрабаваньні калгасаў, забясьпечылі больш выразную арганізацыю продажу тавару лепшым калгаснікам, якія выконваюць свае пляны, байкот гультаеў і прагульшчыкаў.

Яшчэ ў лютым райспажыўсаюз, улічыўшы палітычнае і гаспадарчае значэньне выкананьня квартальнага пляну, разгарнуў конкурс на лепшага кіраўніка і конюха. Было правезена 10 нарад конюхаў, 85 сходаў калгаснікаў, заключаны 64 сацыялістычныя дагаворы. Конкурс мабілізаваў увагу калгаснікаў вакол пытаньня аб беражлівым адносінах да коня. Заключаныя сацдагаворы сыстэматычна правяраліся і тут-жа ўжываліся адпаведныя меры. Калгаснікі калгасу «Прамень камуны» на парадзе кампэрацыі нага актыву так ахарактарызавалі ролю сельспажыўтаварыства: «Наша кампэрацыя своечасова заахвярыла пытаньне падрыхтоўкі коня да сяўбы. Заключыўшы сацдагаворы, палепшыўшы тавараспабжэньне конюхаў, кампэрацыя забясьпечыла лепшы догляд коня».

Пры разгортваньні масавай работы ў калгасных брыгадах і сярод працоўных аднаасобнікаў спажывецкая кампэрацыя скарыстала вопыт Мачахскага ССТ: у кожным калгасе, у кожнай брыгадзе, у кожнай вёсцы выяўлялся лепшы барацьбіты за сяўбу, ім у першую чаргу дастаўляліся дэфіцытныя прамтавары.

Спажывецкая сыстэма правяла вялікую работу па заключэньні сацыялістычна-вытворчых дагавораў паміж кампэрацыяй і калгаснымі брыгадамі.

На здымку: У цэнтры — стар. Случкага райспажыўсаюзу тав. ПЕСІН, зьверху — тав. КОРЗУН (Палікарпаўскае спажыўт.), зьнізу — тав. КІЯВІЦКІ (Серадняковскае сельспажыўтаварыства).

Палікарпаўскае і Першамайскае сельспажыўтаварыствы арганізавалі з работнікаў апарату і актыву сыгнальныя пасты для нагляду за выхадам на работу, за якасьцю працы. На аснове сыгналаў пастоў прадаваліся тавары ў крамах.

Вельмі важна, што большасьць сельспажыўтаварыстваў дабілася актывізацыі работы прадаўцоў; апошнія выйшлі з-за прылаўку і цесна зьвязаліся з калгасамі. Вось што расказвае аб сваёй рабоце прыказчык крамы калгасу «Новы мір» камсамолец тав. Спаднеўскі: «Я арганізаваў выпуск васьмі газэт, штодзённа вывучаў работу кожнай брыгады, а іх было чатыры. Усе брыгады ахапіў сацдагаворамі і праверыў іх выкананьне. Правёў сыстэматычныя выезды з прамтаварамі, прадаваў іх на полі, на аснове ўліку прададзён і якасьці працы. Правёў байкот двух цесьляроў, якія без дазволу брыгадзіра самавольна з

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

ЧЫСТКА ПАРТЫІ—ГЭТА ПРАВЕРКА НЯ ТОЛЬКІ КОЖНАГА КАМУНІСТА ПААСОБКУ, АЛЕ І

праверка работы ўсіх партарганізацый

Узьняць партмасавую работу

На заводзе «Пралетары» (Гомель) пастанова ЦК і ЦКК аб чыстцы партыі прапрацавана на цэхавых і агульназаводзкім партсходах, па рабочых сходах у цэхах і брыгадах. З 7-га па 23 мая працавалі самаправерачныя брыгады. Гэтыя брыгады праверылі работу як усяго партколектыву, так і цэх ячэек і партгруп.

Па ўсіх кампуністаў складзены характарыстыкі. Гэтыя характарыстыкі паказваюць ня толькі твар членаў партыі паасобку, але і агульнае становішча партвыхаваўчай работы на заводзе. Напрыклад, член партыі з 1929 году тав. **Малашэнка** ніякіх партнагрузак не нясе, у школе не займаецца, партсходаў не наведвае. Ён фактычна ўжо членам партыі не зьяўляецца, ад партыі адарваўся. Яшчэ адзін прыклад. Кандыдат КП(б)Б з 1930 году тав. **Доўгі** таксама не нясе ніякіх нагрузак, нідзе ня вучыцца, членскія ўзносы плаціць неакуратна, партсходы наведвае рэдка.

Хто вінават у адрыве т. т. Малашэнка і Доўгага ад партыі? У першую чаргу вінавата сама партарганізацыя, якая ня выхоўвала сваіх маладых партыйцаў, ня прыцягвала іх да партыйнай і грамадзкай работы, не кіравала імі, ня ўказвала ім на іх недахопы.

А вось як справа з кампуністамі-ўдарнікамі: тав. **Ліўшыц** на вытворчасьці ўдарнік, а ў грамадзкай і партыйнай рабоце нярыкладны; тав. **Кушнярэў** таксама ўдарнік, а ў грамадзкай і партыйнай рабоце невыстарчальна прымае ўдзел, школы не наведвае; тав. **Сувораў** — ударнік, але палітычна слаба падрыхтаваны, партузносы плоціць неакуратна. Такіх характарыстык ёсьць яшчэ шмат. Усе яны паказваюць адно — партыйна-масавая работа на заводзе стаіць на вельмі нізкім узроўні, барацьба за добрыя гаспадарчыя паказальнікі не пераплятаецца з палітыка-выхаваўчай работай.

Зараз, у сувязі з падрыхтоўкай да чысткі партыі, у жыцьці партарганізацыі «Пралетара» адчуваецца вялікае ажыўленьне. Самаправерка прайшла масава і ня толькі ўскрыла недахопы, але і дапамагла ліквідаваць іх. Самаправерачныя брыгады далі канкрэтныя і дзелавыя прапановы для паляпшэньня партыйнай работы. Ажывілася работа партгруп, добра наведваюцца партыйныя школы, кампуністы адчуваюць больш адказнасьці за свае вучасткі вытворчасьці і за партыйныя нагрузкі.

І. Б.

Тут аб чыстцы і ня думаюць

На торфзаводзе **«Чырвоны сьцяг»** зусім не адчуваецца, што праз некалькі дзён пачнецца чыстка партыйных радоў.

Ніякай падрыхтоўкі, ніякай растлумачальнай работы сярод рабочых не праводзіцца. Аб чыстцы ніхто не гаворыць.

Назначаны па 25 мая партыйны сход па пытаньні аб чыстцы сарваўся, бо да яго зусім не рыхтаваліся.

Сакратар партыйнай ячэйкі тав. **Русенка** толькі хныкае, што на заводзе прарыў у выкананьні торффінпляну, але нічога ня робіць для мабілізацыі тарфянікаў на ліквідацыю прарыву. Масавая работа сярод рабочых па бараках не праводзіцца. Ячэйка зусім ня ведае рабочых і работніц. У тарфкоме няма нават дакладнага ўліку членаў саюзу. Работа з жанчынамі, якіх на заводзе большасьць, недаацэньваецца.

Калі прыехаў прадстаўнік ЦК і райкаторг па выбарах делегатак тав. **Русенка** ніякай дапамогі ім не аказаў, а наадварот імкнуўся даказаць, што нічога пры такіх труднасьцях нельга рабіць і што «делегаткамі торффінпляну ня выканаеш».

На заводзе працуе многа работніц-сезонніц, а ясьлей няма. Работніцы пакідаюць сваіх дзяцей у бараках бяз догляду. Заключаны дагавор паміж дырэкцыяй і райаддзелам аховы здароўя на адкрыцьцё ясьляй у гэтым годзе на абодвух пасёлках торфзаводу ня выконваецца. Між тым, на заводзе востры недахват рабочай сілы, і калі-б былі ясьлі, можна было-б уцягнуць у вытворчасьць жонак рабочых і больш сезонніц і гэтым папоўніць завод рабочай сілай.

Смалявіцкі РК КП(б)Б павінен зараз-жа, не чакаючы пачатку чысткі, дакладна праверыць усю работу ячэйкі торфзаводу і ўзмацніць яе кіраўніцтва больш працаздольнымі кампуністамі.

Е. З.

ФАРМАЛЬНЫ ПАДЫХОД ДА ВАЖНЕЙШАЙ ПАРТЫЙНАЙ СПРАВЫ

БАБРУЙСК. (Наш кар.).

У першай палове мая па ўсіх ячэйках КП(б)Б раёну і гораду праведзен адзіны партдзень, прысьвечаны пастанове ЦК і ЦКК. Зараз райком праводзіць абсьледваньне работы ячэек. Абсьледваньнем ахоплены ўсе 68 гарадзкіх ячэек. Па 23 ячэйках гэта работа ўжо скончана. З 33-х вясковых ячэек абсьледваньнем ахоплена 29, скончана праверка 8 ячэек.

Абсьледваньне прыносіць вялікую карысьць тым, што дапамагае ячэйкам выкрыць недахопы і выправіць іх, узьняць баяздольнасьць ячэек у цэлым і кожнага камуніста ў паасобку.

Але некаторыя абсьледвацелі з сваімі задачамі не спраўляюцца. **Мальлеўскую** ячэйку, напрыклад, абсьледваў тав. **Мнушкін**. Абсьледвацель не ўвайшоў у сутнасьць работы, сапраўднага становішча ячэйкі ня выявіў.

Тав. Мнушкін ахарактарызаваў работу агульнымі фразамі і шмат чаго наблытаў. У адным месцы напісаў, што «ячэйкай вядзецца барацьба за ўзьняцьце ўраджайнасьці», а ў другім: «ніякай работы з калгаснікамі па пытаньнях агразатэхнікі няма». Не праверыўшы як след ходу сяўбы, ён у выводах напісаў:

«Плян сяўбы па калгасах «Прагрэс», «1 мая», і «Ідэя Леніна» будзе скончан да 20 мая, а па калгасе «Прамень камуны» да 25 мая».

Між тым прайшло 20 мая і 25 мая, а калгасы Мальлеўскага сельсавету сяўбу ўсё яшчэ ня скончылі. У калгасе «Прамень камуны» поўны прарыў: не хапае насеньня бульбы.

Пастанова ЦК і ЦКК аб чыстцы Мальлеўскай ячэйкай прапрацавана дрэнна, вядучая роля камуністаў на полі не ўзьнялася.

Кандыдат партыі **Сурыновіч Мікола** ня справіўся з даручанымі яму абавязкамі палявода. Прышлося яго замяніць беспартыйным калгаснікам. Ня справіўся Сурыновіч таму, што дрэнна адносіўся да сваіх абавязкаў. Гэты-ж Сурыновіч прысвоіў 800 руб. калгасных грошай, асмаліў парсюка і г. д.

Кандыдат партыі **Бычкоў Зьмітра**, працуючы палявым рабочым, сваімі антыпартыйнымі паводзінамі дыскрэдытуе годнасьць камуніста. Ён сыстэматычна позьніцца на работу.

Кандыдат КП(б)Б **Рублеўская Вера** таксама ня служыць прыкладам для калгаснікаў. Мае надзвычай нізкі палітычны ўзровень і не жадае яго павышаць. Зрабіла злачынства—асмаліла парсюка, за што на яе накладзена 200 руб. штрафу.

Вось кароткія характарыстыкі на камуністаў Мальлеўскай ячэйкі, якая налічвае 7 чалавек (3 члены і 4 кандыдаты).

Абгаварваючы пытаньні чысткі на агульным сходзе, партячэйка не завастрыла ўвагі на тых камуністах, якія падрываюць аўтарытэт партыі. Вынесена агульная рэзалюцыя і пасьля сходу ніякай работы вакол пастановы ЦК і ЦКК ячэйка не арганізавала.

Другі прыклад недобрасумленнага падыходу да пытаньня чысткі паказвае **Міхалёўская** парт'ячэйка.

Парт'ячэйка ўстанавіла, што член КП(б)Б т. **Дуренцэін** падпаў пад уплыў клясавага ворага, дапусьціў перасевы і недасевы ў сваім калгасе імя Дзяржынскага. **Бялоўскі** праяўляе недысцыплінаванасьць, ігнаруе пастановы партыі. **Амельяновіч** сарваў раньнюю сяўбу ў калгасе імя Літвінова. Член КП(б)Б тав. **Арэшка** дапусьціў масавую сяўбу ў адзавор.

Ячэйка замест таго, каб адпаведна гэтым фактам даць адзнаку сваім камуністам і вынесьці канкрэтную пастанову, запісала: «Прапанаваць усе пералічаныя недахопы ліквідаваць»...

Або вось якую пастанову выносіць **Прадвейская** ячэйка КП(б)Б. «1. Агульны сход лічыць, што пастанова ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб чыстцы партыі ўпаўне своячасовая. 2. Даручыць бюро ячэйкі КП(б)Б распрацаваць шэраг практычных мерапрыемстваў». І далей перайшлі да «бягучых спраў».

Парт'ячэйка іншаліцкай арцелі **«Бальшавік»** пытаньне аб чыстцы абмеркавала на... закрытым партсходзе. Ей мабыць соромна паказаць беспартыйнай масе рабочых такіх, з дазволу сказаць, камуністаў, як **Гарэлік**, які, зьяўляючыся членам партыі, ніякай работы не вядзе, нават не наведвае партсходаў? Або паказаць **Мілера, Латрушкіна, Лазарава**, якія па 8-9 месяцаў ня плацяць партузносаў? А **Шырокі Я.**, дык той, усту піўшы ў КП(б)Б у 1931 г., зусім ні аднаго разу не плаціў членскіх узносаў.

Гэта парт'ячэйка груба парушае дырэктыву ЦК і ЦКК аб прапрацоўцы пытаньня аб чыстцы на адкрытых партсавых сходах.

Ячэйка **скурсаюзу** прапрацоўку пастановы аб чыстцы адклала на 1 чэрвеня.

На вялікі жаль, РК КП(б)Б не дае належнага адпору ўсім гэтым фактам. Райком пакуль што абмяжоўваецца зборам матар'ялу абсьледваньня і пратаколаў агульных сходаў ячэек, не рэагуючы штодзенна на указаньні скажэньні.

П. Чыкун.

У партарганізацыях напярэдадні чысткі

Ельск

Рэмізаўская парт'ячэйка налічвае 15 членаў і кандыдатаў партыі. Работу ячэйкі можна бачыць з ходу сяўбы. На 21 мая па сельсавеце было засеяна толькі 40 проц. пляну. Значная частка членаў і кандыдатаў ячэйкі не зьяўляюцца перадавікамі на вытворчасьці, а некаторыя нават зьяўляюцца гультаямі. Напрыклад, кандыдат партыі **Цімошчанка Стэпа** ў калгасе «Бальшавік» лічыцца першай гультайкай. З пачатку году яна працавала толькі два дні. Член партыі **Цімошчанка** Лук'ян, які зьяўляецца адказным за конную калёну, у калгасе прыкрывае буйнага спекулянта Гаўшэйна, які пралез у калгас і працуе на стайні. Кандыдат партыі **Баброўка Янка**, баручы калгасных коняй для работы на сваім засеве, зрывае работу калгасных аратых.

Сакратар парт'ячэйкі **Саўчук В.** сам прызнаецца: «Я па сяўбе нічога не рабіў». Факты гавораць аб засьмечанасьці парт'ячэйкі, а між тым пастанова ЦК УсеКП(б) аб чыстцы партыі ячэйкай не прапрацавана. (Белта)

Вузда

Магілянская парт'ячэйка—адзіная па раёне, якая шырока прапрацавала пастанову ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб чыстцы партыі і намеціла канкрэтныя мерапрыемствы па падрыхтоўцы да чысткі.

Партыйцам, якія не зьяўляюцца перадавікамі на вытворчасьці, зроблены адпаведныя ўказаньні. Арганізаваны 4 групы па павышэньні палітычнага ўзроўню камуністаў. Агітатары прапрацоўваюць пастановы ЦК УсеКП(б) аб чыстцы ў вытворчых брыгадах сярод беспартыйных. У выніку разгорнутай масавай работы сяўба ў калгасе закончана на 20 мая.

Астатнія парт'ячэйкі раёну, рыхтуючыся да чысткі партыі, абмеркавалі прапрацоўкай пастановы аб чыстцы на вузкіх партсходах (Бальшавіцкая, Стальбаўская і іншыя), а некаторыя і гэтага не зрабілі. Лашанская і Каменкаўская ячэйкі яшчэ не склалі характарыстык на сваіх членаў. Зянькаўская і Каменкаўская ячэйкі спынілі партвучобу.

Ня складзены характарыстыкі і на ячэйкі. Заг. арг. адз. РК КП(б)Б **Петрайціс** чакае, пакуль скончыцца сяўба: «тады будзе па чым складаць характарыстыкі. Уліку ходу падрыхтоўкі ячэек да чысткі райком партыі не вядзе. (Белта).

Чаму каапгасы Магілева ў хвасьце сяўбы

З кожным днём расьце чырвоны сьпіс каапгасаў, якія скончылі сяўбу. Сярод іх — прыгарадныя гаспадаркі Менску, Гомелю, Баборуйску і інш. З магілеўскіх каапгасаў у гэтым сьпісе няма ні аднаго. Найбольш буйныя прыгарадныя гаспадаркі Магілева — «Давыдаўка», «Новы шлях», «Цішоўка», «Усход» — ганебна адстаюць. Да 26 мая пасеўны плян каапгасамі Магілеўшчыны выканан толькі на 56,8 проц.

Чаму так павольна разгортваецца сяўба па гаспадарках Магілева?

Асноўная прычына — позьні пачатак весняных палявых работ. Калі пераважная большасьць каапгасаў БССР пачала сяўбу ня позьней 10 красавіка, дык у Магілеве прыступілі да сяўбы толькі ў пачатку мая. Спасылаўшыся на вільготную глебу апраўдвалі каапгасы зрыў раньняй сяўбы. Гэта гаварылася ў рэшце, дзе пераважаюць супясчаныя землі.

Дзіве дэкады пайшлі на тое, каб выкрыць і перамагчы кваргуністычныя «вільготныя» настроі.

Калі ўжо ўзяліся за работу, дык змарнілася бяз толку шмат цэнных шчасьлівых час. Неабдуманыя дзеяньні кіраўнікоў каапгасаў, якія нешта ўзварушыліся, дэзарганізавалі рабочую і цягавую сілу. Бяспляновасьць і сьпешка стварылі дзесяткі дробных тормазаў, якія перашкаджалі фарсавайнаму тэмпу сяўбы. Рабочыя і календарныя планы ня былі ўвязаны паміж сабой. Яны часта складаліся без наяўнасьці рабочай сілы, бяз уліку машын, што ёсьць у гаспадарцы. У некаторых выпадках гэтых планаў зусім ня было. У большасьці каапгасаў Магілеўшчыны адразу не ўзяліся за правільную расстаноўку рабочай і цягавай сілы.

Зараз мы можам пачуць у каапгасах скаргі на тое, што не хапае жывой цягавай сілы. Ва ўсім, батыце, вінават... конь. Гэту аб'ектыўную» прычыну пастрымлівае нават кіраўніцтва райпрафсавету на чале з шаноўным ЦК і ЦСПСБ тав. **Шэфэрам**. Такія апраўданьні ня вытрымліваць ніякай крытыкі. У кожнай з магілеўскіх гаспадарак гуляе на стайні па 3-4 кані, якія маглі-б быць скарыстаны на палявых работах. Хтосьці ўздумаў у абавязковым парадку стварыць конскі рэзэрв для так званых «непрадбачаных абставін». Абсьледваньне паказала, што ў 99 выпадках са 100 за «непрадбачаныя абставіны» хаваецца паездка ў горад.

І так на 4 вызыны калі на каапгас! Гэта ў самы напружаны перыяд весняной сяўбы, калі цягавая сіла патрэбна да зарэзу. Паводле самых скромных падлікаў, «вызыны» павялічылі дэфіцыт жывой цягавай сілы на 200 коня-дзён. Іншы калгучы, на магілеўскіх каапгасах за некалькі пяцідзевак недасеяна мінімум 120 га.

Ці прагульваюць толькі «вызныя коні»? Наглядным адказам на гэта пытаньне служыць факт, выяўлены ў каапгасе «Усход». Па пастаяльні конюха Фадзеева, у стайні да 15 мая знаходзілася кабыліца, якая, быццам, павінна была вось-вось акацібіцца. Аказалася, што Фадзееў апускаў грамадзкасьць каапгасу. Ён сьвядома трымаў каня ў стайні, каб тармазіць сяўбу, каб гэтым «вясаліць» дырэктару гаспадаркі, з якім ён быў не ў ладах. Гэта вылазка кулацкага агента сьведчыць аб слабай пільнасьці мясцовай партыйнай арганізацыі, а таксама аб адсутнасьці гаспадарчага вока на стайні.

Коні, ня гледзячы на іх рашаючую ролю ў палявых работах, знаходзіліся па-за ўвагай кіраўнікоў каапгасу.

Вельмі дрэнна скарыстоўваецца трактарны парк. 6 трактараў, якія працуюць у каапгасах «Усход» і «Давыдаўка», сыстэматычна выходзяць са строю. Пры кожным выпадку дробнай паломкі людзі пачынаюць шукаць запасных частак па гарадох БССР, нават РСФСР, а машыны тымчасам прастойвалі па некалькі дзён. Між тым у сельгаскіраўніцтве Беларусаюзу ёсьць выстарчальная колькасьць трактарных запасных частак. На пратягу максімум 10 гадзін яны могуць быць дастаўлены ў Магілеў, трэба было толькі праявіць ініцыятыву.

У каапгасе «Усход» працуе трактар-цягач. Прарабіўшы тры кругі, ён спыняў працу. Паўтадзіны яго раманталі. Потым ён зноў абходзіў тры кругі і зноў ішоў у рамонт. І так на працягу сутак. Гэта гісторыя доўга-б цягнулася, калі-б, нарэшце, не сабраліся механікі, каб вывучыць прычыны псаваньня трактара. Выявілася, што справу тармазіла «дробязь» — трактарыст заліваў газу ў бак не праз фільтр, а непасрэдна з вядра, што забруджвала карбюратар. З-за гэтай «дробязі» цягач замест 20 гадзін фактычна працаваў толькі 7.

У выніку такой арганізацыі палявога рамонту трактарнага парку недасеяна амаль столькі-ж, колькі з-за дрэннага скарыстаньня жывой цягавай сілы.

Вельмі дрэнна дапамагаюць прыгарадным гаспадаркам заводзкія арганізацыі. Возьмем магілеўскі аўтарамонтны завод. У каапгасе «Усход» працуюць два трактары, якія належаць гэтаму заводу. Каапгас павінен плаціць за гэта прадпрыемству прадуктамі. У часе работы трактараў на гаспадарцы «Усход» дырэкцыя аўтарамонтнага заводу дагаварылася з ЦРК аб аказаньні дапамогі трактарамі (таксама за прадукты) і каапгасу ЦРК «Цішоўка». Што робіць адміністрацыя аўтарамонтнага заводу? Яна зьнімае з работы ў каапгасе «Усход» два трактары і перагоняе іх за 12 клм. у «Цішоўку». Прапрацаваўшы там некалькі гадзін, машыны зноў перагоняюцца ў каапгас «Усход». Такая «дапамога», якая патыхае спэкуляцыяй, сарвала своячасовую сяўбу 12 га зямлі.

Каапгас «Давыдаўка» належыць гарбарні імя Сталіна. Да пачатку сяўбы на заводзе шмат гаварылі аб падыходзячай кампаніі. Ва ўсіх пастановах абавязаліся засеяць да 15 мая ўвесь нравы клін, абавязаліся адпрацаваць па 6 дзён, даць туды конскую цягавую сілу. Рэзалюцый вынесена шмат. Але-ж што толку! Дагэтуль у каапгасе працоўная дысцыпліна не наладжана, на работу выходзяць у 7 гадзін і канчаюць у чатыры. Коні і інвэнтар не прымацаваны да адпаведных людзей. Дырэктар заводу тав. Гефэн, які быў арганізатарам гаспадаркі, зараз забыў аб каапгасе, і наогул прадстаўнікі прадпрыемства вельмі рэдкія госьці ў каапгасе.

Такое-ж становішча з гаспадаркай «Новы шлях», якая належыць швейнай фабрыцы імя Валадарскага.

Кіраўніцтва і дапамога з боку прадпрыемстваў у большасьці выпадкаў носіць дэкларацыйны, агульны характар і не дае патрэбнага эфэкту. Прадпрыемствы не ўваходзяць у дэталі работы, не вывучаюць тых ці іншых ненармальных зьяў у каапгасах. Весь чаму яны не маглі выявіць вялікіх недахопаў у скарыстаньні цягавай сілы і своячасова дапамагчы прыгарадным гаспадаркам.

Позьняе разгортваньне палявых работ адбілася і на якасьці працы. Чаму ў каапгасе «Новы шлях», напрыклад, дрэнныя ўсходы жыта? Таму, што не паклапаціліся прабаранаваць вучастак: стварылася корка, якая перашкаджае разьвіцьцю расьлінны.

У каапгасах «Усход» і «Давыдаўка» сеюць уручную цны наяўнасьці радковых сявярак. З-за злоснага ігнараваньня радковай сяўбы страчана 127 цэнтн. аўса.

Ф. РЭМ.

Тав. СЛАБКОВІЧ — парнікавод-ударнік Полацкай прыгарадняй гаспадарні ЦРК. Працоўны стаж 45 год.

Вытруціць буржуазна-нэпманскія тэндэнцыі ў практыцы савецкіх устаноў

Менская гарадзкая кантрольная камісія праверыла рад прадпрыемстваў у галіне выкананьня імі абавязкаў перад дзяржбюджэтам.

Пры праверцы выяўлена, што некаторыя прадпрыемствы, як, напрыклад, **сьпіртазавод, арцель «Дрэваапрацоўшчык», кандытэрская МенЦРК, база Саюзшвэйзбыту, Белнаапмалако** і інш., утойвалі ад дзяржавы аб'екты, падлягаючыя абкладаньню, і несвоячасова ўплачвалі належачыя з іх падаткі, што выклікала накладаньне на кантакарэнты гэтых арганізацый арыштаў і спагнаньне вялікіх сум пені.

ГарКК усё гэта кваліфікавала, як праяўленьне буржуазна-нэпманскіх тэндэнцый, якія дапушчаны ў выніку безадказных адносін да гэтай справы з боку кіраўніцтва пералічаных прадпрыемстваў.

Выходзячы з гэтага МенгарКК КП(б)Б пастанавіла:

За ўтойваньне дзяржаўнага падатку 266.563 руб. і адсутнасьць належнага ўліку збыту прадукцыі (яшчэ ня складзена справаздача за 1932 год) дырэктару сьпіртазаводу тав. **Пікусу** і галоўбуху Міліўскаму абвясьціць вымову.

За ўтойваньне ад абкладаньня дзяржпадаткам 77.383 руб. звароту—старшыню арцелі **«Дрэваапрацоўшчык»** тав. **Левіна**, як новага работніка, папярэдзіць аб недапушчальнасьці такіх зьяў, б. галоўбухгальтару **Бэрэнштэйну** абвясьціць суровую вымову.

За ня выплату своячасова дзяржпадатку, **што прывяло да ўплаты 80 тыс. руб пені**, загадчыка базы Саюзшвэйзбыту тав. **Каждана** папярэдзіць, а галоўбухгальтара аддаць пад суд.

Катэгарычна папярэдзіць кіраўніцтва ЗРК АДПУ тав. **Альпяровіча і Кухона**, арцелі «Ударнік» тав. **Шамеса і Нарыкона**, Белкаапмалако тав. **Арапутчыка і Слоўшча**, што ў далейшым малейшае затрыманьне ў своячасовай выплаце дзяржпадатку, або непаказ сапраўдных сум, падлягаючых абкладаньню дзяржпадаткам, да іх будуць прыняты самыя суровыя меры спагнаньня.

Прэзыдыум гарКК папярэдзіў усіх кіраўнікоў і галоўных бухгальтараў прадпрыемстваў, арцеляў, сталовак і ЗРК, што з іх боку павінна быць праяўлена максімум увагі да своячасовай выплаты дзяржпадатку і канчатковага павінны быць зьнішчаны факты буржуазна-нэпманскіх тэндэнцый, якія праяўляюцца ў форме ўтойваньня адпаведных сум ад абкладаньня дзяржпадаткам.

Ільля Эрэнбург

Апошнія бізантыйцы

У рэдакцыю адной парыскай газэты прышоў ліст з глухой вёсачкі: «Шаноўны пане! Упрашаю вас ня кідайце мой ліст у кошык перш чым не прачытаеце яго! Перашлеце яго каму належыць. Я — матка шматлікай сям'і. Мой чалавек працуе на ферме, яму плацяць 15 франкаў у дзень. Падумайце, якім дарагім для мяне цяпер выяўляецца хлеб! А ў гэты час п. мэр і яго суседзі кормяць курэй самай адборнай пшаніцай. Гэта вельмі заможныя людзі. Скажэце, што вы пра гэта думаеце? Расьсьледуйце, толькі хутчэй і не агалашайце, тады вы самі пераканаецеся ў гэтым. Я не падпісваюся, каб ня гневаўся на мяне пан мэр. Даруйце мне за гэта! З найтлы-бейшай пашанай маці шматлікай сям'і».

Рэдактар ня кінуў ліст у кошык — гэта быў скептычны і вясёлы чалавек. Ён далучыў скаргу «маткі шматлікай сям'і» да калекцыі такіх-жа наіўных і сьмешных лістоў. Нядаўна ён выдаў цэлы томік падобных пасланьняў. Што да «маткі шматлікай сям'і», то балай яна і цяпер уадыхае над брамапуткамі пана мэра. Ён і не падумалася, што гэты адважны муж заняты выратаваньнем гінучай цывілізацыі. Яна нічога ня чула пра вазін, а вазін — апошняе дасягненьне дзяржаўнай мудрасьці. Пшаніцу афарбоўваюць вазінам, каб людзі ня кваліліся есьці танны хлеб. Зерня крывяногага колеру ядуць куры або сьвіньні.

П. Андрэ Тард'е — правадыр апазыцыі. Ён журбуе аб лёсе Францыі — Францыя аддала перавагу не яму, а нейкім дёкадумным радыкалам. Пан Тард'е — дзяржаўны розум. Апрача таго ён член «Акадэміі гастраномаў». Рэпартэр надрабязна апісвае апошнее сьнеданьне пана Тард'е. Аказваецца, пан Тард'е ясьў качку па-руанску, г. зн. раздробленую і зараную у яе ўласнай крыві. Пасьля чаго ён і заявіў захопленаму рэпартэру аб неабходнасьці антысэмізму.

Пан Тард'е ясьў качку ў яе ўласнай крыві. Але ў Парыжы знайшліся гасьтраномы, якія не задаволіліся пошлымі хачкамі. Нядаўна на вялікім банкеце «цара прыроды» з падпіўкай з мадэры.

Куры пана мэра клявалі якуюсь пшаніцу: куры гэта вяскоўшчына! У іх няма ні чулага падніжэньня, ні фантазіі. Адзін з парыскіх рэстаратараў завёў у сябе абеды для сабак. Скотчтэр'ры або кітайскія шоу-шоу могуць цяпер увайсьці ў таямніцы гастранамічнай акадэміі. Маладым сучкам даюць бісквіты «біска». Для сабак-вэгетэрыянцаў — малочная лапша або зялёны гарошак. Для лёгкадумных кабялёў — «рэгаль дэ-ніка»: кансамэ з морквай і з рубленым мясам. Для паважных сабак — «гурмандыз мязон»: сырое мяса і аўсянка з пікантнай падліўкай. Сабачы абед каштуе 10 франкаў. Навук, балай, заўважыць, што зарэгістраваны рабочы атрымлівае ў дзень 8 франкаў. Але на гэта можна адказаць, што беспрацоўны нішто іншае, як двуногая дварняжка, а сабакі, якіх водзяць у рэстаран — прадстаўнікі вышэйшых рас і ўладары найдаражэйшых родаслоўных.

Чалавецтва, як відаць, дасягнула тэй ідэальнай ступені культуры, калі яно мае права ганьбуючы людзьмі, заняцца жывёламі і птушкамі. Кажуць, што на ліпарскіх астравох жывуць птушачкі і п. Мусаліні вельмі строга загадаў птушачак ахоўваць. «Вялікабрытанскае таварыства прыяцеляў птушак» паднесла п. Мусаліні залаты мэдаль: «Вялікадушнаму шанавальніку птушак». Кажуць таксама, нібы германскія фашысты зьбіваюць яўрэяў, катуюць зьняволеных, расстрэльваюць камуністаў. Але і гэта нудная проза. «Дацкае таварыства апекі жывёлы» паслала п. Гітлеру ўдзячны адрас: «Вы скасавалі яўрэйскі забой жывёды і гэтым паказалі сябе высокім гуманістам».

Адкуль атрымае прывітаньні парыскі рэстаратар, які частуе сабак рэдкаснымі стравамі? З Румыніі? З Японіі? Ці можа ад парыскіх беспрацоўных?..

Кожны дзень прыносіць новыя довады спрыяньня і праграсу. Тысячы паэтаў турбуюцца пра адпачынак пацярыжан. Пачалося ўсё з ніру. У дожкаў ляжалі дзяўчыны. Маладыя людзі кіда[illegible] беспарадку сьмешна ўзьвізгвалі. Ад страляньня паэты перайшлі да плаваньня: дзяўчаты нырэлі перад расчуленымі хлышчамі. Хлышчы пілі коктэйлі і разглядалі мокрых красунь. Аднак, і нір і басейн — пацеха мінулага веку. Патрэбна было штосьці сучаснае. Праўда, фабрыканты заводзяць размовы пра тое, што трэба пераходзіць на ручную працу. Праўда, Жорж Дэвамэль, поўны пагарды да машыны прасьлаўляе страдаўні пот, калі не на сваім лобе, то на лобе антыдзітчнага зямляроба. Але ўсё-ж парыжане аддаюць перавагу аўтамабілю перад буколічкай канякай. Паэты дадумаліся: яны прыраўналі дзяўчын да аўтамабіляў. У Парыжы адкрыўся новы дансінг «Таксі-герльс». Наведвальнікі купляюць талёны: гэта талёны на дзяўчын. Дзяўчыны апранутыя ў форму, і на грудзях, там, дзе павінна быць кахаючае сэрца—значок фірмы: ДТ. Талён каштуе паўтары франка. Наведвальнік запрашае дзяўчыну на танец. Яна ня мае права яму адмовіць. Ён можа сьпіваць, сапці або кепска пахнуць — гэта яго сьвятое права. Дзяўчына павінна ўсьміхацца і танцаваць. Газэты з задаваленьнем адзначаюць, што дзяўчыны таксі зусім не прастытуткі, не, гэта ў поўнай меры прызваітыя асобы. Да крызісу яны былі манікюршамі, стэнаграфісткамі або актрысамі кіно. Цяпер ім давялося зьмяніць серца на таксаматор.

Я ведаю, што сабачы рэстаран або таксі-герльс ніяк не Парыж. Я пачаў з пацешлівых глупстваў таму, што я люблю гэту краіну і гэты горад. Лёгка пасьмяцца з нейкага сабачага рэстарану, але ўсьмешка пераходзіць у балючую прымасу, калі замест таксі-герльс даводзіцца бачыць перад сабой прадстаўнікоў высокай культуры.

Пісьменьніка Андрэ Маруа добра ведаюць за межамі Францыі. Яго кнігі перакладзены на безьліч моваў, у тым ліку і на рускую. Ён напісаў найлепшыя біяграфіі Дызраэлі і Байрона. Апрача таго ён майстэрскі раманіст. Ён глыбока адданы думкам і пачуцьцям сваёй клясы. Ён быў уладальнікам суконнай фабрыкі і пра гэта цяжка забыць, нават чытаючы старонкі, прысьвечаныя «чыстаму каханьню». Для жонак і дачок як суконных, так і нясуконных фабрыкантаў Андрэ Маруа — улюбёны пісьменьнік, дарадца серца, духоўнік. Газэты, якія цяпер паносяць Андрэ Жыда, з захапленьнем сочаць за любым росчаркам Андрэ Маруа. Вядома, Маруа не прадстаўнік [illegible] Рышар Блёк, Шансон, Бляэ Сандрар, Барбюс, Віяльдрак — гэта таксама французы. Але Андрэ Маруа — пісьменьнік той Францыі, якая галасуе за «левых рэспубліканцаў», есьць качак па-руанску і дрэмле ў крэслах, эканомна пакрытых чахлами. З дрэмы яе выводзяць толькі парляментскія інтрыгі або сэнсацыйныя забойствы. На яе межах ляжаць зброяй разьюшаныя фашысты. Але яна спакойна дрэмле. Біцьцё яе серца называецца «скандаламі»—ад «скандалу Устрыка» да «скандалу Аэрапосталі». Яна супроць цэмры, яна за прагрэс, але ход гісторыі ёй марыцца прыемнай пагулянкай па дарожках Вішы або Вітэлю. Ён не знай сьці сабе лепшага паэта, чым Андрэ Маруа.

Сто год жыцьця клясы — вялікі тэрмін, і я зусім не хачу сьмяцца з старасьці. Я не патрабую ад Маруа ні бойкі пры прадстаўленьні «Эрнані», ні прыгожага вар'яваньня Бальзака, ні жрэцкай дваглядзінасьці Флёбера, ні мужнасьці Заля. Я ведаю, што ў нас 1933 год і што прафэсія Калюмба ніякага падабенства ня мае да прафэсіі таго «сіндыка», якога прызначаюць ліквідаваць збанкрутаваўшую фірму. Але цяжка і душна цяпер у Эўропе. Гітлераўцы распальваюць на плянох нямецкіх гарадоў вогнішчы, з роўнай разьюшанасьцю яны палюць «Капітал» Маркса і паэмы Гейнэ, працы Эйнштэйна і «Прыгоды ўдалага вояка Швэйка». Італьянцы разьмахваюць старэнькімі рымлянамі. Яны ўздымаюць рукі к небу і перахрышчваюць высакапрыгучлкі ў нэа-Рубіконы. На Балканах трасуцца троны царкоў, а банды новых Прынцыпаў бадзяюцца з набітымі рэвальвэрамі. Народы бушуюць і, як улетку з сутарэньня нісьне холад зімы, з краін, захваченых фашыстамі, пятыкае холадам другога сярэднявякоўя. Што-ж робіць, бачачы гэта трагічнае вар'яцтва, клясычны французкі «розум»? Вядома, я не чакаў ад Андрэ Маруа прарочых слоў, але я меў права чакаць хоць-бы звычайнай устурбаванасьці. Маруа, аднак, падпяшаецца і, сапраўды, пяжка правесьці грань паміж яго раўтамі і таксі-герльс.

Я падаю апісаньне аднаго з вечароў, спатканага на сваёй бескляпотнасьці. Гэта апісаньне зьявіцца ў вялікай парыскай газэце. Мой пераклад дакладны і я толькі прапусьцію дванцаць або трыццаць прозьвішчаў тытуляваных асоб.

«Пані Андрэ Маруа, прыбраная ў нябесна-блакітную сукню вясны, з кажуходзіць па ўлоньне апостальскай царквы свайго народжанага хрышчэньня. Рэпартэры ўмеюць апісваць ня толькі дыямэнтавыя стрэлы на карсажы адважных дам, але таксама глыбіні ўнітаваў:

«Жан Както адказвае за свайго хрышчэньня.

— Ці адракаецеся вы ад д'ябла?

— Так.

— І ад усіх яго спраў?

— Так.

На руках у сваёй карміліцы мацаны П'ер дэ-Масо спакойна і моўчкі вытрымлівае выпрабаваньне ў вадзе. Ён ня зводзіць вачэй з Жана Както. Както прарочыць:

— Ён будзе арганістам.

— Чаму?

— У яго ногі арганіста».

Часамі гэтыя бястурботныя і прыгожыя душы вырашаюць заняцца высокай палітыкай. Нядаўна ў Парыжы адбылася ўрачыстая вымчка перадавых французкіх розумаў з нямецкімі малойчыкамі са штурмовых атрадаў. Немцы зьявілі з рукавоў свастыку і стараліся весьці сябе прызваіта, як у добрым сямейным доме. На чале гэтых добра выхаваных пагромшчыкаў стаяў граф Мірбах-Гельдэрн. Сярод французаў былі прадстаўнікі самых розных арганізацый ад «Асацыяцыі каталіцкай моладзі» да «Універсытэцкай сацыялістычнай ліг». Сярод французаў былі таксама пісьменьнікі, напрыклад, п. Альфрад Фабр-Люс. Гэта той самы п. Альфрад Фабр-Люс, жонка якога, згодна газэтных справаздач, натхнілася адвадзнай ідэяй наконт шасьці дыямэнтавых стрэл. Сам п. Фабр-Люс паказаў сябе здольным на ўсё, куды больш адважныя. Разам з п. Фабр-Люсам на франка-фашысцкай нарадзе быў прысутны супрацоўнік лявейшых журналаў п. П'ер Дрыё-ля-Рашэль.

Немцы падрабязна тлумачылі французам, чаму яны палічны наладжваць яўрэйскія пагромы і палічь «марксыцкія кн

З канфэрэнцыі па раззбраеньні

Англія не згаджаецца на забарону паветранай бамбардыроўкі

ЖЭНЭВА, 28. (БЕЛТА). Сёньня генэральная камісія працягвала абмеркаваньне разьдзелу ангельскага праекту аб паветраных узбраеньнях. Спрэчкі вяліся вакол ангельскай прапановы аб дапушчальнасьці паветранай бамбардыроўкі ў «аддаленых раёнах».

Савецкая делегацыя патрабавала з 34 артыкулу ангельскага пляну, які гаворыць: «Поўнае скасаваньне паветранай бамбардыроўкі, за выключэньнем паветранай бамбардыроўкі з паліцэйскімі мэтамі ў пэўных «аддаленых раёнах», — зьняць другую частку артыкулу, пачынаючы са слоў «за выключэньнем...».

Тав. Штэйн заявіў: «Выключэньне з агульнага правіла, якое катэгарычна забараняе паветраную бамбардыроўку, ператварыла-б у нішто самую забарону. Ня можа быць зьнята сумненьне наконт таго, як сустрэне насельніцтва гэтых «аддаленых раёнаў» той падарунак, які яму рыхтуе 34 арт. у яго цяперашняй форме. Яшчэ большую небясьпеку становіць гэта выключэньне ў яго цяперашняй рэдакцыі, якая абмяжоўваецца напамінкам аб «аддаленых раёнах», асьцярагаючыся, аднак, дакладна вызначыць гэтыя раёны.

Трэба думаць, што канфэрэнцыя ня вгодзіцца захаваць у такэсьце канвэнцыі такое геаграфічнае новаўвядзеньне, якое зможа быць расшыфравана кожным з урадаў, як яму здумаецца. Калі аўтары праекту цьвёрда пераконаны, што насельніцтва «аддаленых раёнаў» — мабыць з прычыны іх аддаленасьці ад адміністрацыйных цэнтраў — павінна атрымаць т. зв. плады сучаснай цывілізацыі ў форме бомб, кінутых з паветра, дык прынамсі неабходна і лёгічна заўчаснапаведаміць, насельніцтва якіх раёнаў павінна карыстацца такой сумнай прывілеяй».

Дэлегацыі краін Малой Антанты падтрымліваюць савецкую прапанову.

Поль Бонкур (Францыя) прапанаваў замест «аддаленых раёнаў» пісаць «калёніі». **Ідэн** (Англія) абараняе ангельскую прапанову аб дапушчальнасьці паветранай бамбардыроўкі ў «аддаленых раёнах», канстатуючы, што такая бамбардыроўка — агульнапрыняты мэтад у адносінах мандатных тэрыторый. Паветраная бамбардыроўка, заяўляе Ідэн, неабходна у адносінах насельніцтва розных дзікіх, асабліва горных раёнаў», якія «знаходзяць задавальненьне ў нападах на суседзяй».

Дэлегаты Польшчы, Германіі, ПАЗШ і Кітаю выказваюцца за забарону паветранай бамбардыроўкі. На гэтым пасяджэньне канчаецца.

„Савецкі саюз мае права ганарыцца сваімі дасягненьнямі“

Гутарка прадстаўніка ТАСС з італьянскім паслом

ТЫФЛІС, 29 (Белта). 27 мая раніцою італьянскі пасол п. **Аттоліко** ў суправаджэньні ваеннага аташэ **дэ-Фэрары** выехаў на цеплаходзе «**Армэнія**» з Батуму праз Адэсу ў Маскву. У той-жа дзень а 10 гадзіне раніцы выйшлі з Батуму італьянскія падводныя лодкі «**Трыконо**» і **Дэльфіно**».

Перад ад'ездам з Батуму п. **Аттоліко** ў гутарцы з супрацоўнікам ТАСС заявіў наступнае: «Я ўжо наведаў аднойчы Батум, прыкладна каля 2-х год назад. Праўда, гэта быў неафіцыяльны візыт. Уражаньне, атрыманае ад гэтага наведаньня, было настолькі дадатным, што пажадаў у другі раз наведаць Батум, скарыстаўшы для гэтага прыбыцьцё сюды дзьвёх італьянскіх падводных лодак. Для мяне было прыемным сюрпрызам даведацца, што гэта першы візыт на лодкі італьянскіх, але наогул замежных падводных лодак у Батум. Звараю вашу ўвагу на тое, што Італія была першай краінай, чые ваенныя караблі, ваенныя самалёты (на чале з генэралам Бальбо) наведалі Савецкі саюз. Такім чынам устанавілася тэндэнцыя да ўзаемных візітаў паміж СССР і Італіяй. Гэта зразумела, бо абедзьве краіны прытрымліваюцца палітыкі міру.

У Батуме, таксама як і ў Тыфлісе, я быў прынят надзвычай гасьцінна і сардэчна. Я быў-бы рад праз ТАСС падкрэсьліць у вашым друку гэту акалічнасьць. Асаблівае ўражаньне зрабіла на мяне наведаньне савецкага крэйсэра. Я быў захоплен дасканалым становішчам экіпажу і магу засьведчыць, што Савецкі саюз мае права ганарыцца тым, што такія судны, якія я бачыў, пабудаваны на савецкіх вэрфях і з савецкіх матар'ялаў.

З вялікаю цікавасьцю я пазнаёміўся з будаўніцтвам універсытэцкага гарадка ў Тыфлісе, які зрабіў на мяне найлепшае ўражаньне. На падставе асабістых наглядньняў і атрыманых вестак прыходжу да вываду, што Тыфліс сапраўды зьяўляецца важным культурным цэнтрам, які, у прыватнасьці, можа дапамагчы ўзрастаючаму абмену навуковымі часопісямі і кнігамі паміж Італіяй і Грузіяй».

ЗАБАРОНА УВОЗУ ГЕРМАНСКІХ ТАВАРАЎ У АЎСТРЫЮ

ВЕНА, 29 (Белта). Аўстрыйскі друк паведамляе ад надыходзячай ЗАБАРОНЕ ЎВОЗУ ГЕРМАНСКІХ ТАВАРАЎ У АЎСТРЫЮ. У пляне барацьбы супроць Германіі знаходзіцца таксама новая паездка ДОЛЬФУСА ў Рым, якая адбудзецца другога чэрвеня. У Рыме ім будзе падпісан канкардат. Адначасова ў Рым выяжджае вэнгерскі прэм'ер Гембэш. Згодна паведамленьня друку, на нарадах Муса ліні з Дольфусам і Гембэшам будуць абмяркоўвацца мерапрыемствы сумеснай барацьбы Італіі, Аўстрыі і Вэнгрыі супроць аншлюсу і наогул супроць германскай экспансіі ў сярэдняй Эўропе і на Балканах.

У венскіх палітычных колах абмяркоўваецца пытаньне аб забароне нацыянал-сацыялісцкай партыі.

Учора ў ваколіцах ІНСБРУКУ адбыліся сутычкі паміж нацыянал-сацыялістамі і членамі хэймвэру. 28 чалавек цяжка паранены, у тым ліку 2 жандары. Сярод нацыянал-сацыялістаў праведзены арышты.

Фашысцкім тэорам не зламаць рэвалюцыйнага руху

ВАРШАВА, 29 (Белта). Афіцыёзная «ГАЗЭТА ПОЛЬСКА» з поваду данцыгскіх выбараў адзначае: «Камуністычныя лідэры арыштаваны, сацыялісты тэрарызаваны, партыя цэнтру не праяўляе ажыўлёнай дзейнасьці. Нацыяналісты чакаюць свайго блізкага канца. Нацыянал-сацыялісты напоўнілі горад карычневымі мундзірамі і сьцягамі са свастыкай».

Усе польскія газэты падкрэсьліваюць, што, ня гледзячы на тэрор нацыянал-сацыялістаў і поўны разгром выбарчага апарату кампартыі, камуністы здолелі захаваць свой уплыў.

Ліга нацый зноў адклала разгляд антыяўрэйскай палітыкі Германіі

ЖЭНЭВА, 28. (БЕЛТА). Абмеркаваньне скаргі германскага грамадзяніна яўрэя **Бэргхейма** на антыяўрэйскую палітыку ў Верхняй Сілезіі зноў адкладзена Саветам Лігі нацый да 29 мая. Афіцыяльна адтэрміноваваньне матывуецца тым, што дакладчык Лігі **Лестэра** нібыта яшчэ не гатоў. У сапраўднасьці, аднак, як перадаюць, адтэрміноўка выклікана разгалосьлямі паміж дакладчыкам і германскай делегацыяй.

Данцыгскія нацыянал-сацыялісты абяцаюць захоўваць канстытуцыю

БЭРЛІН, 29. (Белта). Сёньня данцыгскі нацыянал-сацыяліст **Раушнінг** зрабіў у Бэрліне прадстаўніком друку паведамленьне аб будучай палітыцы нацыянал-сацыялістаў у Данцыгу. Раушнінг, абяцаючы захоўваць канстытуцыю і існуючыя дагаворы, заявіў: «Некаторыя дагаворы невыпасімы на доўгі тэрмін для Данцыгу. Некаторыя меры, праведзены ў Германіі, ня змогуць быць праведзены ў Данцыгу».

Аб адносінах да Польшчы Раушнінг сказаў: «Нацыянал-сацыялізм лічыць, што мір на Усходзе можа быць забясьпечан толькі на аснове роўнаправя і паважаньня правоў абедзьвюх нацый. Аднак, **любая гатоўнасьць да міру мае свае межы** ў абароне жыцьцёвых правоў».

Магутная дэманстрацыя парыскага пралетарыяту

ПАРЫЖ, 29. (Белта). «Юманітэ» паведамляе, што ў арганізаваным учора кампартыяй паходзе да сьцены камунараў на могілках **Пэр-ля-шэз** прымала ўдзел 75.000 чалавек. У паходзе прымалі ўдзел рабочыя ўсіх раёнаў Парыжу, а таксама рабочыя, пры быўшыя з правінцыі, камсамольскія і піянэрскія арганізацыі, шматлікія делегацыі спартыўных, жаночых і рэвалюцыйных студэнцкіх арганізацый, прадстаўнікоў замежных і калёніяльных рабочых. Паход цягнуўся каля 4-х гадзін. Наперадзе ішлі вэтэраны парыскай камуны і члены ЦК КПФ на чале з тав. **Кашэнам**.

Дэманстрацыя прайшла з вялізарным уздымам пад лёзунгамі барацьбы супроць фашысцкай рэакцыі, за амністыю, супроць новай імпэрыялістычнай вайны, у абарону СССР.

Марсэль Кашэн піша, што пасьля вайны ва Францыі **ня было больш шырокай рэвалюцыйнай дэманстрацыі, чым дэманстрацыя, якая адбылася 28 мая.**

Згодна канчатковых вестак, нацыянал-сацыялісты атрымаюць у новым данцыгскім парляманце ня 37, а 38 мандатаў.

ПАПРАЎКА

У зводцы аб ходзе сяўбы па БССР па пяцідзённых і ў перадавым артыкуле, зьмешчаным у газэце «Зьвязда» ад 29 мая ўкраліся памылкі. У газэце надрукавана, што за трэцюю пяцідзённку па БССР засеяна 310.525 га, за чацьвертую пяцідзённку 393.655 га і за пятую — 386.511 га.

У сапраўднасьці за трэцюю пяцідзённку засеяна 341.316 га, за чацьвертую 437.025 га, за пятую — 343.141 га.

У перадавым артыкуле ў трэцім абзацы замест на 7.144 га менш, трэба чытаць — на 93.884 га менш.

Ю. Дардак

Прытупленая зброя

(Часопісь „Камуністычнае выхаваньне“)

Часопісь «Камуністычнае выхаваньне» мела ў мінулым рад прарываў. У гэтай часопісі знайшлі сабе месца тэарэтыкі «мэтадаў праектаў», рознага гатунку клясава-варожыя нацыяналістычныя выступленьні, аб якіх пісалася ўжо на старонках мясцовага друку.

Пастанова ЦК партыі аб школе павінна была служыць выходным пунктам у справе перабудовы часопісі. Гэта пэдагагічная часопісь, адзіная ў БССР, павінна была сапраўды па-бальшавіцку весьці барацьбу на два фронты за ленінскую палітэхнічную школу, павінна была стаць арганізатарам і кіраўніком мас настаўніцтва ў барацьбе за ліквідацыю «карэннага недахопу» школы, узьняцьця на вышэйшую ступень барацьбы з «мэтадалёгіч ным пражэктэрствам» і г. д. Цэнтральным стрыжнем усёй работы часопісі павінна была зьявіцца распрацоўка мэтодыкі паасобных дысцыплін у школе, пастаноўкі працоўнага навучаньня і паліэхнізацыі, узбраеньне настаўніцтва марксыцка-ленінскай мэтадалёгіяй.

Ці спраўлялася рэдакцыя часопісі з тымі заданьнямі, якія былі даны ЦК КП(б)Б? На вялікі жаль, не. Замест арганізацыі кіраўніцтва масамі настаўніцтва часопісь ператварылася ў фатографа і фіксатара зьяў, бяз усякага аналізу, пляну, сыстэмы.

Праўда, у часопісі № 4-5, які вышаў з друку ў канцы верасьня, мы маем перадавую, дзе нібы ёсьць намёк на нейкія пляны сыстэму работы рэдакцыі. Так, у артыкуле намечаны былі 5 разьдзелаў у часопісі: 1) за марксыцка-ленінскую тэорыю ў пэдагогіцы; 2) за тэхніку пэдагагічнага працэсу; 3) абмен вопытам працы; 4) за пэдагагічныя кадры; 5) крытыка, бібліяграфія, хроніка.

На першы погляд можа здацца, што рэдакцыя мае плян і сыстэму ў асьвятленьні асноўных праблем гэтых ад дзелаў. Калі-ж прыгледзецца бліжэй, —робіш вывад адзін: у рабоце рэдакцыі паўнейшы самацёк. За ўвесь 1932 год вышла 5 нумароў (з іх тры падвойных. Апошні вышаў з друку № 7-8 у сьпудзені 1933 году, а № 9-10 вышаў гэтымі днямі.

Для характарыстыкі, таго, як рэдакцыя запаўняе зьмест адзначаных у перадавой аддзелаў, падамо некалькі лічбаў. Так, аддзел «за тэхніку пэдагагічнага працэсу», які павінен быць цэнтральным у газэце, — займае па сваім матар'яле ўсяго якіх-небудзь 25 проц. На працягу трох нумароў у гэтым аддзеле пытаньням мэтодыкі адводзіцца толькі адзін артыкул, астатнія агульна-арганізацыйныя і то ў пераважнасьці прысьвечаны фізкультуры, лясной школе і інш. Зусім няма артыкулаў па мэтодыцы паасобных дысцыплін, артыкулаў аб сьвядомай дысцыпліне, аб мэтодыцы інтэрнацыянальнага выхаваньня ў школе. Затое ў часопісі шмат агульных разважаньняў аб пэдагогіцы, аб вышэйшай школе і тэхнікумах, і зусім мала аб масавай школе.

Гэтыя колькасныя паказальнікі сьведчаць толькі аб тэй бясплянавасьці і бяссыстэмнасьці, якая існуе ў часопісі. Яшчэ горш стаіць справа з якасьцю матар'ялаў. Амаль ні адзін артыкул, за выключэньнем артыкулу тав. Панкевіча «Супроць тэорыі адміраньня школы», не мабілізуе настаўніцтва на барацьбу за ліквідацыю карэннага недахопу, за павышэньне якасьці навучаньня, аўладаньня тэхнікай пэдагагічнага працэсу. Больш таго, у радзе артыкулаў працягваецца апалёгетыка буржуазнай школы.

Так, у № 4-5 зьмешчан артыкул Субоціной аб «лясной школе». З першых-жа радкоў артыкулу ўзводзіцца паклёп на савецкую ўладу, нібы ў нас, у Савецкім саюзе амаль што адна трэць дзяцей фізычна аслабленыя. Субоціна піша: «Па даных дзіцячых дыспансэраў Масквы, дзяцей і падросткаў, якія маюць фізычную аслабленасьць, налічваецца ад усёй колькасьці школьнікаў 30 проц.». Гэта падносіцца без указаньня крыніц—адкуль узята лічба, за які год і інш. Зразумела, што такі агульны тэзіс толькі на руку клясаваму ворагу.

Больш таго, на працягу ўсяго артыкулу аўтар ідэалізуе «лясныя школы». Так, прыводзячы прыклад маскоўскай школы (аб колькасьці выдаравэўшых). Субоціна піша: «Вынікі працы іншых лясных школ (напрыклад, швэйцарскіх, бэльгійскіх) даюць яшчэ больш значныя дасягненьні ў аздараўленьні фізычна аслабленых дзяцей (стар. 56, № 4-5). Для ўгрунтаваньня гэтага на працягу ўсяго артыкулу аўтар спасылаецца на Амэрыку, Германію і інш. буржуазныя краіны, ідэалізуючы паотку ньку буржуазных лясных школ. І гэта пішацца ва ўмовах усеагульнага крызісу каліталістычнай сыстэмы, калі кожны год скарачаюцца выдаткі на асьвету, закрываюцца школы, дзеці працоўных застаюцца па-за школамі, аб чым аўтар нічога не гаворыць, усхваляючы буржуазныя «лясныя школы».

Гэты палітычна шкодны артыкул «шлапы» з рэдакцыі часопісі надрукавалі бяз усякіх заўваг.

Ёсьць у часопісі матар'ялы, якія проста дэзарыентуюць настаўніка, якія перапоўнены «лявацкімі» ўстаноўкамі. Да гэтых артыкулаў напрыклад, адносіцца матар'ял былога намесьніка Наркамасьветы т. Брыгневіча «Год барацьбы за рэалізацыю пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)В аб пачатковай і сярэдняй школе».

У артыкуле рад фактаў, якія сьведчаць аб некаторых зрухах у справе барацьбы за ліквідацыю карэннага недахопу школы. З гэтых фактаў робіцца па сутнасьці апартуністычны вывад: «Усе гэтыя моманты сьведчаць аб масавым руху за рэалізацыю пастановы аб школе. Выходзячы з лічбовых даных з 25 раёнаў—сярэдняя пасьпяховасьць вучняў па БССР складае 87,5 проц. У паасобных раёнах гэта лічба павышаецца. Так, напрыклад, Менскі —92 проц., Лёзьнянскі, Полацкі —91 проц., Слуцкі—90 проц., Варысаўскі—89,6 проц., Пятрыкоўскі—89,4 проц. і інш. Горшыя раёны даюць 83,4 проц. і нават 75,9 проц. пасьпяховасьці (Вялікамольскі раён). Школы першага канцэнтру, у тым ліку і пачатковыя даюць ніжэйшыя паказальнікі, чым школы другога канцэнтру. Сярэднюю пасьпяховасьць вучняў школ БССР у 87-88 проц. трэба прызнаць яўна здавальняючай». (Часопісь № 7-8, стар. 14).

Апрача таго, што гэтыя лічбы штампаваныя, неправераныя, яны памылковыя. Паводле катар'ялаў НДІ камвыхаваньня мы маем зусім іншыя лічбовыя даныя аб пасьпяховасьці вучняў. Тэзіс, што ў БССР пасьпяховасьць яўна здавальняючая, дэмабілізуе настаўніцтва. Такі тэзіс азначае, што ў БССР ужо ліквідован «карэнны недахоп» школ. Палітычна такі тэзіс зьяўляецца «ўклонам турэцкага», — паказвае ў фальшывым сьвятле сапраўднае становішча навучаньня ў школе.

Прыкладам пранятаньня «лявацкіх» установак у галіне сацыялістычнага спаборніцтва зьяўляецца артыкул тав. Шашкова.

Аўтар выступае супроць прэміяваньня ў школе, супроць індывідуальнага спаборніцтва. «Нам думаецца, — піша ён, — што ў справе камуністычнага выхаваньня, у справе разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва ў школе бяз гэтых фактараў (прэміяваньня, чорных дошак і г. д.) зусім можна абыйсьціся, што ў іх няма ніякай патрэбы што, наадварот, усё гэта можа замяніць сабой добрая арганізацыя сапраўдлістычнага спаборніцтва ў школе і правільнае кіраўніцтва ім» (там-жа, стар. 53).

Гэта вышла ў друку ў лютым 1933 году, калі пленум ЦК ДКА прыняў пастанову аб значку «ўдарніка вучобы», аб тым, што асноўнай формай сацыялістычнага спаборніцтва зьяўляецца індывідуальнае спаборніцтва паміж вучнямі, вучнямі і бацькамі.

Разьмеры артыкулу не даюць магчымасьці прывесьці рад фактаў аб тых скажэньнях, якія ёсьць у іншых артыкулах часопісі.

Ня гледзячы на рад папярэджаньняў ЦК КП(б)Б, часопісь «Камуністычнае выхаваньне» ня стала баявым органам партыі ў барацьбе за марксыцка-ленінскую пэдагогіку. Яна пранятае свае мінулыя «лявацкія» ўстаноўкі.

Неабходна зараз-жа карэнным чынам перабудаваць работу часопісі. Трэба паставіць часопісь на службу сацыялістычнаму будаўніцтву, каб яна сапраўды стала органам барацьбы за якасьць вучобы, за сьвядомую дысцыпліну.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Дзевяць мільёнаў рублёў на школьнае будаўніцтва

СНК БССР даў дырэктыву закончыць будаўніцтва тых школ, пабудова якіх пачата летась і раней. Усяго па Савецкай Беларусі трэба закончыць будаўніцтва 394 школ. На гэту мэту мясцовым бюджэтам адпушчана 7.740 тысяч руб.

У Гомелі, Віцебску, Бабруйску, Лепелі, Воршы, Жыткавічах, Тураве і Менску будзе скончана будаўніцтва мураваных будынкаў сямігодак. Па астатніх раёнах трэба скончыць будаўніцтва пачатковых школ і будынкаў для няпоўных сямігодак.

Апрача сродкаў на скончэньне школьнага будаўніцтва па мясцовых бюджэтах адпушчана капл 1.500 тыс. руб. на капітальны рамонт школьных будынкаў.

Адкрыцьцё парку культуры і адпачынку

У пачатку чэрвеня пачынае працаваць Менскі парк культуры і адпачынку.

У гэтым годзе парк дэкарацыйна ўпрыгожан і абсталёван. Упрыгожаньні будуць сканцэнтраваны вакол сапрый і дамоў адпачынку. У парку будуць абсталяваны дзьве дзіцячыя пляцоўкі: адна крытая ў сярэдзіне посу і адна ад крытая на сонечным месцы, дзе а дзець ні будуць займацца вопытныя кіраўнікі.

Вызначана спэцыяльная зона для аднадзеннага адпачынку ўдарнікаў гораду. У адпаведна абсталяваных палатках працоўныя атрымаюць добры і культурны адпачынак.

У парку 200 гамакоў і пляжанак.

Сачыце за ходам сяўбы



На будынку НКЗБ выставлены дошкі перадавых і адстаючых раёнаў па сяўбе. На здымку: Капя чырвонай дошкі.

Тытун на асушаных балотах БССР

У 1931 годзе ўпяршыню балотна-дасьледчым інстытутам зроблена спроба пасадкі тытуну на высушаных гарфяных балотах БССР.

Засаджаныя на камароўскіх балотах 2 га розных гатункі махоркі, бакуноў, цыгарных і папяросных тытуноў далі ўраджай значна вышэйшы, чым тытуны, высаджаныя на украінскіх чорназемах. Напрыклад, ураджай махоркі на чорназемных глебах роўны адной тоне з га, у той час, калі ўраджай на гарфяной глебе дае 73 цэнтн. з га. Ураджай бакуноў даходзіць да 100 цэнтн. з га, цыгарных і папяросных тытуноў да 35 цэнтн. з га.

Высокая ўраджайнасьць тытуноў на гарфяной глебе гаворыць аб вялікай перспэктыўнасьці разьвіцьця тытуноводзтва ў БССР, у прыватнасьці, на балотах Палесься і ва ўсходніх частках Менскага, Магілёўскага і Клімавіцкага раёнаў.

На плянах другой пяцігодкі прадугледжана асушыць звыш 100.000 га гарфяных балот БССР, з якіх будуць выдзелены спэцыяльныя гарфяныя масывы для разьвіцьця тытуноводзтва ў шырокім вытворчым маштабе.

Ліст у рэдакцыю

Паважаны тав. рэдактар

Прашу зьмясьціць мой адказ т. Шаткіну на частку яго артыкулу ў адносінах да мяне («Зьвязда» 16-III — 33 г.). Тав. Шаткін абвінавачвае мяне ў значных мэтадалёгічных і палітычных хібах у выкладаньні гісторыі Беларусі ў ВПІ. Пры праверцы маёй працы ўсе абвінавачаньні не пацьвердзіліся, аб чым вось пастанова партыйнай часткі катэдры.

З камуністычным прывітаньнем

Я. ВІТКОЎСКІ.

Паведамленьні

31 мая, а 6 гадз. увечары на нараду пры Культпропе ЦК КП(б)Б (п. № 101, 5-ты паверх) павінны зьявіцца наступныя таварышы:

Конаваў (ЦП саюзу мэдсанпрацы), Пагаеў (ЦП саюзу мукамолаў), Пэўзнер (ЦП саюзу машынабуд.), Гесэн (ЦП саюзу гарбароў), Фіо (ЦП саюзу швэйнікаў), Нехічык (ЦП саюзу МТС), Шчарбацевіч (ЦП саюзу лесасплаў), Корзун (ЦП саюзу жывёлагадоўч. саўгасаў), Іскіна (ЦП саюзу гарнадпрыемстваў), Сьвярдлоў, Араблей, Зелькіна (культаддзел ЦСПСВ), Лабуо (рэспубліканская школа прафруху), Жукаў, Левіт, Скуман, Лебензон, Малаковіч (БІМЗО), Кушнярэў, Узілеўская (музэй Рэвалюцыі), Улазаў, Грыцук, Пружынін, Калакоў, Гаўрылік (НКАсьветы), Пугачоў, Белотнікаў, Горфінкель, Розін, Зайдэльман (інстытут гісторыі партыі), Квапінскі, Гайдук, Альтман (ДВВса), Арлос, Аляксейчык (курсы партактыву), Вальфсон, Халявін (гарком КП(б)Б), Праўда (Бібліятр. ін-т), Окур (ВКСГШ), Каляда, Шашлоў, Калянічэнка, Ачысьціевіч, Сямёнава, Вэйрах, Мацанава (інстут камвыхав.), Вычкоўская (Дзярж. бібліятэка), сакратар ячэйкі КП(б)В дзяржбібліятэкі, загадчыкі культпропаў партколектываў ВНУ, ВТНУ і асьпірантуры (ВНУ, асьпір. БелАН і інш.).

КУЛЬТПРОП ЦК КП(б)Б.

— Культпропі Менгаркому КП(б)Б 1-га чэрвеня г. г., у 7 гадз. вечара, у Доме Камасьветы (клюб Карла Маркса) склікае нараду культпропаў, партколектываў і ячэек, рэдактараў шматтыражак і насьцендгазет і культработнікаў фабзаўкомаў па пытаньні аб чысьцы партыі. Явка абавязковая.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Чырв. Зорка — Каса—ад 1 г. дня — МЯДЗЬВЕДЖАЕ ВЯСЕЛЬЕ (АПОШНІ ШЭМЭТ) драма ў 7 част. з пралёгам і эпілёгам

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ — 2-ая сэрыя 2-ая амэрыканскага прыгодніцкага фільму ШПАРКІ

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР Імя 8-га сакавіка — Савецкая № 90 — Новы савецкі мастацкі фільм ВЫТРЫЦЬЕ СЬЛЁЗЫ ў 6 частках. Пачатак сэансаў: Дзённых: 2, 3-30 і 5, Вячэрніх: 7 і 8-30. Каса—з 1 г. дня.

ПРАЛЕТАРЫ — СІЛА І ХАРАСТВО кайздыч ў 6 частках. з удзелам Пат і Паташона

СПАРТАК — Выдатны мастацкі фільм ТАРАС ТРАСІЛА драма ў 7 част. Каса—з 3 г. 30 м.

НАВУЧАЛЬНЫ КАМБІНАТ „СОЮЗОРГУЧЕТА“ з 1-га чэрвеня г. г. арганізуе групу СТАРШЫХ БУХГАЛЬТАРОЎ ДЛЯ СЫСТЭМЫ БЕЛПАДГАРОДНІНА

На курсы прымаюцца бухгальтары і памбухі са стажам работы па двайной бухгальтэрыі на менш 2-х год.

Стыпэндыя курсантам устанаўліваецца ад 100 да 150 руб. у месяц, апрача гат-га 25 руб. натэрыяльных.

Інтэрнатам курсанты не забясьпечваюцца.

Пасьля сканчэньня курсанты павінны прапрацаваць на раёне у в шэйпаказанай сыстэме ня менш 2-х год.

Курсанты прымаюцца да сталоўні.

Заявы з далучэньнем дакумантаў аб сацыяномічны, сапхаджаньні, аб рабоце бухгальтарам ці памбухам ня менш 2-х год. аб узросьце, аб адносінах да вайсковай павіннасьці (для мужчын), аб прадоўным стажы і даведку адміністрацыі ці праўленьня калгасу аб вызваленьні з апошняга мейсца працы, ці вучобы,—накіраваць па адрасу: Менск, Міхайлаўская 1-4, 3-я школа, Навучальнаму Камбінату „Союзоргучет“.

Пры непрадстаўленьні ўсіх пералічаных дакумантаў заявы разглядацца ня будуць.

Тэрмін падачы заяў да 15-га чэрвеня г. г.

Да дня пачатку вучобы будзе паведамлена кожнему заліченаму паведамленьнем на дом.

Навучальны камбінат „СОЮЗОРГУЧЕТА“

Менгарком КП(б)Б і фракцыя Менгаржылсаюзу

СКЛІКАЮЦЬ

1-га ЧЭРВЕНЯ г. г.,

у 7 гадз. вечара, у залі пасяджэньняў ГарКК КП(б)Б (Карла Маркса, 14)

нараду ўсіх старшынь і загадчыкаў дамамі жактаў і ЖБКТ гор. Менску—партыйцаў.

ЯЎКА АБАВЯЗКОВАЯ.

Менгарком КП(б)Б. Менгаржылсаюз.

... TO LIVE.

ЖЫЦЬ

НОВЫ ГУКАВЫ мастацкі прыгодніцкі фільм

ВЫДАВЕЦТВУ „ЗЬВЯЗДА“ ПАТРЭБНА МАШЫНІСТКА

ЗВАРАЧАЦЦА: Савецкая, 63, 2-гі паверх.

Абавязковая пастанова № 12

Менскага Гарадзкога Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў

28 мая 1933 г. г. Менск

Аб охове садоў, сквэраў і зялёных насаджэньняў

Менскі Гарадзкі Савет Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Забараніць на бульварах, сквэрах і ў садах апульнага карыстаньня:

а) Ходзіць, сядзець і ляжаць на траве;

б) Ламаць дрэвы і кусты ў садах і сквэрах і рваць расьліны, кветкі і траву;

в) Засьмечваць і кідаць паперу, акуркі, пачкі ад папіросаў і іншае сьмецьце;

г) Ламаць садовыя лаўкі, граткі, платы і інш. пабудовы ў садах;

д) Праводзіць гульні і займацца спортам за выключэньнем месц, спэцыяльна адведзеных для гэтай мэты;

е) Езьдзіць па дарожках на волесыпедах і на канёх;

ж) Пасьвіць коз, кароў і інш. хатнюю жывёлу, як на бульварах, сквэрах, у садах, так і на вуліцах.

2. Забараніць прывязваць каней на час стаянкі да дэкарацыйных дрэў, якія растуць на вуліцах, плошчах, рынках і да іх агароджаньняў.

3. Вінаватыя ў парушэньні гэтай абавязковай пастановы прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасьці штрафу да 3-х рублёў, які ўцягваецца на месцы ўчынку — міліцыі або членам таварыства садзейнічаньня міліцыі

На асоб, якія адмаўляюцца ад уплаты штрафу, складаецца пратакол, на якому накладаецца штраф да 50 рублёў або да 7 дзён прымусовых работ.

4. Асобы, вінаватыя ў навмысным псаваньні зялёных насаджэньняў, прыцягваюцца да крымінальнай адказнасьці.

5. Нагляд за выкананьнем гэтай абавязковай пастановы ўскладаецца на міліцыю, членаў таварыстваў садзейнічаньня міліцыі і на вартаўнікоў садоў і сквэраў.

Нам. старшыні Менскага Гарадзкога Савету КАРАНЕЎСКІ.

За сакратара Менскага Гарадзкога Савету КЛЕБАНАЎ.

ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ЧАСОПІСЬ КУЛЬТПРОПУ ЦК КП(б)Б па кіраўніцтву раённымі газэтамі, фабрычна-заводзкімі, энтэсаўскімі, саўгаснымі шматтыражкамі

„БАЛЬШАВІЦКІ ДРУК“

ВЫХОДЗІЦЬ ДВА РАЗЫ У МЕСЯЦ

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ўсіх паштова-тэлеграфных аддзяленьнях і пасьтовых станцыях.

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: на адзін месяц—1 руб.; тры месяцы—3 руб. да канца году—8 руб.

Выдавецтва „Зьвязда“

ПАСТАНОВА № 13

Менскага Гарадзкога Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх дэпутатаў

28 мая 1933 г. Гор. Менск.

Пра парадак унясеньня зьмен у выданыя пашпартныя дакументы

Менскі Гарадзкі Савет Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Зьмена вестак у выданых пашпартных дакумантах (пашпартная кніжка, пашпартным блянку, часовым пасьведчаньні) робіцца толькі для асоб, не дасягнуўшых 16-гадовага ўзросту, унесеных у выданы пашпарт дарослым.

Гэтыя зьмены уносяцца:

а) пры дасягненьні 16-гадовага ўзросту або сьмерці асобы, унесенай у пашпартны дакумант;

б) пры нараджэньні і ўсынаўленьні дзіцяці;

в) пры неабходнасьці перанесьненьня асоб, унесеных у пашпарт аднаго супруга, у пашпарт другога супруга.

Зьмены іншых вестак, унесеных у выданыя пашпартныя дакументы, да скончэньня тэрміну дзейнасьці гэтых дакумантаў, не робіцца.

2. Паказаныя ў п. 1 зьмены могуць быць унесены толькі органамі РС міліцыі. Зьмены, унесеныя іншымі установамі, лічацца несапраўднымі і пашпартны дакумант, у які гэтыя зьмены унесены, лічыцца несапраўдным

3. Уласьнік пашпартнага дакумэнту, у які пасьлянны быць унесены зьмены, абавязан у 3-дзённы тэрмін прадставіць у орган РС міліцыі па месцы свайго жыхарства свой пашпартны дакумант і адпаведную даведку (пасьведчаньне) органаў ЗАГС'у.

Пры выключэньні з пашпарту асоб, дасягнуўшых 16-гадовага ўзросту, прадстаўленьне даведкі органаў ЗАГС'у неабавязкова.

Народжаныя дзеці запісваюцца ў пашпартны дакумант аднаго з супругаў па іх жаданьні.

Перапіска дзяцей з пашпартнага дакумэнту аднаго супруга ў пашпартны дакумант другога супруга робіцца толькі пры абаюдным згодзе супругаў, або па рашэньні суловых органаў.

4. За ўнясеньне зьмен у пашпартны дакумант ніякая плата не спаганяецца.

5. Вінаватыя за невыкананьне гэтай пастановы прыцягваюцца да адказнасьці ў адміністрацыйным парадку штрафу да 100 руб, або прымусовым работам да 14 дзён.

Нам. старшыні Менскага Гарадзкога Савету КАРАНЕЎСКІ.

За сакратара Менскага Гарадзкога Савету КЛЕБАНАЎ.

На падставе пастановы прэзыдыуму Менгарсавету ад 9/V-г.г.

у мэтах уліку крыніц вадазабесьпячэньня ў горадзе ПРАПАНУЕЦЦА ўсім жактам, установам, прыватным дамаўласьнікам, на абшарах якіх знаходзяцца СТУДНІ, ЗАРЭГІСТРАВАЦЬ

іх да 10/VI-33 г. у Менгарсавеце (пляц Волі № 2, пакой № 3).

Вінаватыя ў невыкананьні гэтага будуць прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасьці.

МЕНКАМГАС.

БАБРУЙСКАЯ КААПЭРАЦЫЙНА-ПРАМЫСЛОВАЯ АРЦЕЛЬ „ГАЛЯНТАРЭЙШЧЫК“ ЗЬЛІВАЕЦЦА в арцельню „ПРАГРЭС“.

Усякія прэтэнзіі да арцелі „Галянтарэйшчык“ павінны быць прад'яўлены да 1-га чэрвеня, пасьля ўказанага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць.

Камісія па зьліцьцю.

Згубленыя і украдзеныя дакументы лічыць несапраўднымі

КАМСАМОЛЬСКІЯ ВІЛЕТЫ: Церашкоў У. І., Ванштэйн А. Д., Фесько В. І., Алешка М. Ю., Правят Г.